ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 101 (1417) | Серада, 23 снежня 1959 года | Цана 40 кап.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
Аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

22 снежня 1959 года ў Вялікім Крамлёўскім палацы адкрыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум ЦК зацвердзіў наступны парадак дня:

аб далейшым развіцці сельскай гаспадаркі (аб мерапрыемствах па выкананню рашэнняў XXI з'езду КПСС і снежаньскага (1958 г.) Пленума ЦК аб уздыме земляробства і павелічэнні вытворчасці збожжа, цукровых буракоў, бавоўны і іншых тэхнічных культур, бульбы, гародніны, фруктаў, вінаграду і іншых прадуктаў раслінаводства; аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі і павелічэнні вытворчасці мяса, малака, воўны, яек і іншых прадуктаў жывёлагадоўлі; аб умацаванні калгасаў і саўгасаў кадрамі; аб далейшай механізацыі сельскай гаспадаркі, павышэнні прадукцыйнасці працы і зніжэнні сабекошту прадукцыі; аб умацаванні грамадскай гаспадаркі калгасаў і павышэнні матэрыяльнага дабрабыту калгаснікаў) — даклады: Савета Міністраў РСФСР, ЦК Кампартыі Украіны, ЦК Кампартыі Казахстана, ЦК Кампартыі Беларусі, ЦК Кампартыі Узбекістана, ЦК Кампартыі Таджыкістана і ЦК Кампартыі Азербайджана.

На ранішнім пасяджэнні Пленум ЦК заслухаў даклады: кандыдата ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, Старшыні Савета Міністраў РСФСР тав. Д. С. Палянскага, кандыдата ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, Першага сакратара ЦК Кампартыі Украіны тав. М. В. Падгорнага, члена Прэзідыума ЦК КПСС, Першага сакратара ЦК Кампартыі Казахстана тав. М. І. Бяляева.

На вячэрнім пасяджэнні былі заслуханы даклады кандыдата ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, Першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі тав. К. Т. Мазурава і Першага сакратара ЦК Кампартыі Узбекістана тав. Ш. Р. Рашыдава.

Для ўдзелу ў рабоце Пленума ЦК запрошаны першыя сакратары абкомаў, крайкомаў і ЦК кампартый саюзных рэспублік не члены ЦК, сакратары ЦК кампартый саюзных рэспублік, крайкомаў, абкомаў партыі, якія кіруюць сельскай гаспадаркай, загадчыкі сельскагаспадарчых аддзелаў ЦК кампартый саюзных рэспублік, крайкомаў, абкомаў партыі, некаторыя сакратары райкомаў партыі; старшыні Саветаў Міністраў саюзных і аўтаномных рэспублік, намеснікі старшынь Саветаў Міністраў саюзных рэспублік па сельскай гаспадарцы, старшыні саўнаргасаў, міністры сельскай гаспадаркі саюзных і аўтаномных рэспублік, начальнікі краявых, абласных упраўленняў сельскай гаспадаркі, міністры воднай гаспадаркі саюзных рэспублік; некаторыя дырэктары саўгасных трэстаў і саўгасаў; вучоныя, старшыні калгасаў, перадавікі сельскай гаспадаркі; начальнікі і галоўныя канструктары дзяржаўных і спецыяльных канструктарскіх бюро па трактарабудаванню і сельскагаспадарчаму машынабудаванню і галоўныя інжынеры заводаў, дырэктары і галоўныя інжынеры трактарных заводаў, а таксама вядучых заводаў сельскагаспадарчага машынабудавання; кіраўнікі навукова-даследчых інстытутаў па механізацыі сельскай гаспадаркі і іншыя кіруючыя работнікі міністэрстваў і цэнтральных ведамстваў, рэдактары цэнтральных газет і часопісаў; адказныя работнікі апарату ЦК КПСС.

Пленум ЦК КПСС працягвае сваю работу.

ВЯЛІКІ РОСТ

Кастусь КІРЭЕНКА

Позняй восенню, пад вечар разветранага непагоднага дня, я прыехаў на сваю радзіму — у калгас імя Леніна Слаўгарадскага раёна.

Вядома, куды лепш прыязджаць у вёску вясной, калі цвітуць сады і ўсё наваколле аж звініць галасамі ажыўшай прыроды, або летам, поўным вясёлых колераў даспявання, багатым сонечным святлом і цеплынёю. Восень сваім холадам і пахмурнасцю робіць вясковыя краявіды нейкімі як бы непрытульнымі, неабжытымі, пустэльнымі... Вядома, гэта на першы погляд, і ўражанне такой няўтульнасці і апусцеласці трымаецца больш часу ці менш у залежнасці ад таго, якімі вачамі і з якім сэрцам глядзіш на зямлю.

Ці трэба казаць, што вёска Гайшын, дзе я нарадзіўся і вырас, дзе жыве мая маці, вабіць мяне да сябе не як дачніка, а як роднага сына; мне прыемна прыязджаць туды ў любую пару, мяне заўсёды цікавяць і хвалююць будні маіх аднавяскоўцаў, маіх землякоў і аднакашнікаў. За доўгія гады я так і не здолеў аддзяліць іх жыццё ад майго ўласнага жыцця. Таму, я думаю, у мяне і знікла адразу пачуццё асенняй непрытульнасці, як толькі я ўбачыў дарагія знаёмыя твары, вочы і ўсмешкі. Хоць дзень ужо канчаўся, а, можа, менавіта якраз таму, я хутка адчуў працоўнае ажыўленне калгаснай гаспадаркі, дзе людзі спяшаліся дакончыць свае дзённыя справы, і, прайшоўшы па вёсцы, убачыў, што за кароткі час у калгасе адбыліся вялікія змены. Аб гэтым сведчылі і нова-пачатыя будынкі калгаснай жывёлагадоўчай фермы, і шыферныя дахі хат калгаснікаў, і новая лінія электраперадачы, і толькі што пабудаваны, праўда, яшчэ, відаць, часовы дашчаны гараж.

Вечарам гэтага дня мы сядзелі за размовай у адной хаце маёй вёскі. Гэта хата амаль такая ж, як і тая, у якой я нарадзіўся, але ў многім яна ўжо не такая. Яна мала чым адрозніваецца ад майго гарадскога жылля. Яна складаецца з двух пакояў, патынкаваных і набеленых. Пад столлю ў абодвух пакоях гарэлі лямпачкі. На стале не змаўкаў рэпрадуктар, хата напаўнялася песнямі самадзейнага калгаснага хору. Мы гаварылі аб сваёй сустрэчы і нам не заміналі гэтыя харавыя спевы. Яны нават як бы дапаўнялі настрой, рабілі нас удзельнікамі вячэрняй весялосці.

Раптам лямпачкі пагаслі. Мы пасядзелі ў цемнаце хвіліну і дзве, а потым гаспадыня выйшла ў сенцы, доўга грукала, варочала цэбрамі, пакуль адкрыла падполле і дастала захаваную там лямпу-газоўку. Яна там была захавана роўна год, з таго часу, як калгас пусціў сваю электрастанцыю. Гаспадыня запаліла газоўку і мы зноў убачылі адзін аднаго. І, божа мой, як пры гэтым цьмяным святле раптам змяніліся твары, яны сталі нейкімі змрылістымі, пастарэлымі, і паветра ў хаце змянілася, і гаворка ўжо неяк не клеілася. Праз некалькі хвілін, на шчасце, электрасвятло вярнулася, — відаць, на электрастанцыі нешта правяралі, а зараз уключылі лінію зноў. Гаспадыня хуценька патушыла газоўку.

— Цьфу! Каб ты правалілася!—злосна вылаялася яна, несучы газоўку з хаты. — Гэта ж проста не верыцца, што некалі трэба было жыць пры такім асвятленні.

Гутарка на хвіліну перапынілася. Але вось у хату зноў вярнулася ранейшая ўтульнасць, і гутарка ажыла сама сабой. Гэты выпадак са святлом павярнуў нашу размову ў нейкі вельмі блізкі для ўсіх план — план перабудовы нашага жыцця. Усім хацелася выказаць свае меркаванні па пытанню: як гэта атрымалася, што вось адзін толькі год яны жывуць з электрычнасцю, а, між тым, так да гэтага прывыклі, што і ўявіць сабе не могуць, што калісьці столькі год жылі пры газоўцы... Гаспадыня на гэту тэму выказалася рашуча і катэгарычна:

— Што ж тут дзіўнага. Лепшае заўсёды мацней за горшае. Ды калі я ўбачыла лепшае, дык на ліха мне тое горшае ўяўляць...

— Што правільна, то правільна, — адказаў гаспадар. — Але ўсё ж гэта не адказ на наша пытанне. А я думаю — таму так хутка і беспаваротна прывыкаем мы да лепшага, што мы ўсім сваім жыццём былі падрыхтаваны да яго. Праўда, трошкі, на жаль, затрымліваўся яго прыход. Вось партыя і прыняла рашэнні, каб гэтае лепшае, якога мы заслугоўваем, хутчэй настала...

— Гэта праўда! Гэта вялікая праўда! — загаварылі ўсе наперабой. — Толькі дзякуючы гэтым рашэнням, зусім іншым стаў наш калгас, пайшло ўгору наша жыццё!

Я з вялікай радасцю слухаў іхнія словы. Што было з калгасам імя Леніна яшчэ некалькі год назад, я добра знаю. Вядома мне і ўсё тое новае, што намоцна ўвайшло ў жыццё калгасных хлебаробаў, — яго інакш не назавеш, як светлым, радасным, натхняючым, высокім.

Каб правільна ацаніць сённяшняе, абавязкова трэба кінуць вокам хаця б у недалёкае мінулае. Два з паловай цэнтнеры збожжавых з гектара — ураджайнасць палёў, пяцьсот пяцьдзесят літраў малака на фуражную карову — прадукцыйнасць жывёлагадоўчай фермы, шматгадовая запушчанасць грамадскай гаспадаркі і амаль поўная адсутнасць сродкаў на яе развіццё — так выглядалі справы ў маім родным калгасе каля пяці год назад. Ці варта казаць, што пры такіх умовах і на працадні калгаснікі атрымлівалі лічаныя грамы і капейкі. Цяпер пра тыя часы ніхто не хоча ўспамінаць. Бо каму хочацца варушыць у памяці ўспаміны пра неўладкаваныя дні і гады; пра іх успамінаюць з такой жа неахвотай, як пра адыйшоўшую ў нябыт газоўку.

Затое кожны калгаснік з уздымам прыгадае гістарычны Пленум ЦК КПСС, які назаўсёды ўвайшоў у памяць народа пад назвай Верасневскага. Бо менавіта з часу першага здзяйснення яго пастаноў і пачаўся новы етапіс жыцця калгаса імя Леніна на Слаўгарадчыне. Партыйная арганізацыя раёна пачала вылучаць на працу ў калгасы лепшых камуністаў, якія мелі багаты вопыт практычнай работы. Праўда, часам у лік лепшых трапляў хто-небудзь і горшы. Так часова здарылася было і ў калгасе імя Леніна. Некаторы час тут на пасадзе старшыні прабыў чалавек, няварты давер'я народа. Але памылка хутка была выпраўлена. І лютага 1956 года па рэкамендацыі камуністаў калгаснікі абралі старшынёй сваей арцелі вопытнага агранома-практыка, маладога камуніста Аркадзя Авяр'янавіча Куземчыкава. І, трэба сказаць, на гэты раз калгаснікі не памыліліся. Камуніст Куземчыкаў паказаў сябе здольным арганізатарам мас. Прайшло нямнога часу, а калгас з адстаючых у раёне стаў выходзіць у лік перадавых, неаднаразова займаючы першыя месцы па выпрацоўцы мяса і малака.

Сёння калгас імя Леніна яшчэ не такі багаты, як праслаўленыя «Рассвет» ці «Камінтэрн» у той жа Магілёўскай вобласці. Але гэта ўжо і не бедная гаспадарка. Самай адметнай рысай гэтай гаспадаркі з'яўляецца тое, што яна **пайшла ў рост**, стала хутка і рашуча набіраць тэмпы. А гэта сведчыць аб яе будучыні. За некалькі год у гэтым калгасе навучыліся замест двух цэнтнераў атрымліваць з гектара ў сярэднім восем цэнтнераў збожжавых; надойваць ад кожнай фуражнай каровы за год замест пяцісот кілаграм малака ў сярэднім дзве з палавінай тысячы літраў, а дамагаюцца і трох тысяч. Умеюць тут цяпер вырошчваць у сярэднім на кожны гектар пасеву па 800—850 цэнтнераў зялёнай масы кукурузы і многае іншае. Чатыры гады назад калгас меў адну разбітую аўтамашыну, а цяпер тут—цэлая свая машынна-трактарная станцыя, дзе ёсць больш дзесяці аўтамашын, трактараў, камбайнаў, розных іншых сельскагаспадарчых машын і прыстасаванняў. Калгасная электрастанцыя дае ток у хаты калгаснікаў і разам з тым прыводзіць у рух 16 электраматораў, якія аблягчаюць працу людзей.

Як жа заканчвае калгас гэты сельскагаспадарчы год, з чым ён прыйшоў да вялікай падзеі ў жыцці нашай краіны—снежаньскага Пленума ЦК КПСС, які абмяркоўвае пытанні далейшага ўздыму сацыялістычнай сельскай гаспадаркі нашай краіны.

— Сёлетні год, — расказвае Аркадзь Авяр'янавіч, — быў для нас крыху пяжкаватым у некаторых адносінах. Па-першае, мы прынялі ў склад свайго калгаса цэлых дзве вёскі, узбуйніліся за кошт зліцця з адстаючым, слабым калгасам. Значыць, паказчыкі нашы рэзка ўпалі. Але справа не столькі ў паказчыках, колькі ў тым, што нам давялося шмат сіл патраціць на тое, каб узняць далучаную да нас гаспадарку да ўзроўню ўсяго калгаса. Па-другое, як вядома, сёлета нам шмат шкоды прынесла засушлівае лета...

Безумоўна, акалічнасці, аб якіх гаворыць старшыня калгаса, пэўным чынам адбіліся на выніках вытворчага года. Але ўсё ж і пры гэтым дасягнутыя вынікі нельга лічыць благімі. Хоць засуха спаліла амаль усю ярыну і значна знізіла ўраджай жыта, калгас усё ж атрымаў збожжа столькі, што здолеў, засыпаўшы поўныя зерневыя фонды, выдаць калгаснікам на працадзень па аднаму кілаграму збожжа. Гэта пакуль што авансам. Але, бадай, лепшым будзе прыклад, які расказвае пра жывёлагадоўлю. Калгас мяркуе павялічыць свой статак настолькі, каб да 1 студзеня 1961 года на кожныя 100 гектараў сельгасугоддзяў мелася дзесяць кароў. Гэтага зрабіць немагчыма без пабудовы новых памяшканняў і без стварэння трывалай кармавой базы. Таму сёлета тут пачалі будаўніцтва круглага кароўніка з поўнай механізацыяй, дзе будуць утрымлівацца 200 кароў. У гэтым жа годзе ў калгасе павялі змаганне і за высокія ўраджаі кукурузы. Калгаснікі ўпэўніліся ў сіле кукурузы, і таму вырошчваць яе ўсё больш і больш знаходзіцца ахвотнікаў. Трактарыст Радчанка з прычэпшчыкам Стаднікам узяліся ўдвух засеяць, апрацаваць, вырасціць і ўбраць кукурузу на 42 гектарах. І вось іх ураджай: тысяча трыццаць чатыры цэнтнеры зялёнай масы з кожнага гектара! А ў сярэднім з усёй плошчы пасеву сабрана ў калгасе па 882 цэнтнеры зялёнай масы. Гэта дало магчымасць нарыхтаваць на кожную фуражную карову па 16 цэнтнераў высокаякаснага кукурузнага сіласу. Не забыліся і на свінаматак—ім таксама падрыхтавана па добрай зімовай порцыі гэтага пачастунку.

Працоўныя намаганні членаў сельгасарцелі імя Леніна, як і поспехі іх сяброў у многіх другіх калгасах, шчыра заўважаны і высока ацэнены. За высокія ўраджаі кукурузы, атрыманыя ў 1959 годзе, калгас імя Леніна ўзнагароджан Ганаровай Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Такім чынам, нават неспрыяльныя кліматычныя ўмовы гэтага года не маглі значна падзейнічаць на вынікі працы калгаснікаў, дружны энтузіязм якіх мае перад сабой вялікую мэту—забеспячэнне найвышэйшага ва ўсім свеце жыццёвага ўзроўню савецкага народа.

— Што ж датычыць цяжкасцей, якія былі ў нас пасля ўзбуйнення,— гаворыць старшыня калгаса, — дык яны часовыя. Хоць калгас «Новы шлях», які да нас далучыўся, быў слабаваты ва ўсіх адносінах, але наш здаровы калектыў хутка зрабіў добры ўплыў на новых членаў арцелі, і праца цяпер у нас ідзе добра.

Калі Аркадзь Авяр'янавіч Куземчыкаў гаворыць, я не магу не адзначыць яго ўпэўненасці ў творчай энергіі людзей. Відаць, што ён улюбёны і ў сваю справу, і ў тых, з кім яе робіць. Ён загараецца, голас яго гучыць амаль узнёсла, калі расказвае аб маладой даярцы Раісе Ганчаровай, якую нядаўна прынялі кандыдатам у члены партыі. Гэта Раіса — дачка нашай суседкі, і я яшчэ зусім нядаўна помню яе вучаніцай. Таму мяне вельмі цікавіць яе гісторыя. Гісторыя простая, але якая прыгожая! Скончыла Раіса дзесяць класаў і вырашыла застацца ў родным калгасе. Ей прапанавалі стаць даяркай. З усім запалам ма-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Думкі пра спецыялізацыю

Спецыялізацыя калгаснай гаспадаркі — надзённае пытанне. Яно заслугоўвае грунтоўнай размовы. Як вядома, калгасам ужо даўно дадзена права самастойна вызначаць памеры і структуру пасяўной плошчы.

Многія калгасы рэспублікі на справе даказалі, што яны здольны рацыянальна выкарыстоўваць свае багатыя вытворчыя магчымасці. Вось прыклад. Калі ў 1953 г. у калгасах рэспублікі пад кармавымі культурамі было дзесяць працэнтаў пасяўной плошчы, то летась — 26 працэнтаў. За гэты час павялічылася колькасць дойных кароў амаль у паўтара разы, што дазволіла павялічыць продаж дзяржаве малака амаль у чатыры разы.

Пяць год назад у рэспубліцы было ўсяго 45 калгасаў, якія на сто гектараў зямлі атрымоўвалі звыш дзесяці тысяч літраў малака, а сёлета такіх калгасаў стала больш у 38 разоў.

Сельская гаспадарка Беларусі, як прадугледжана рашэннямі XXI з'езду КПСС, і ў далейшым будзе спецыялізавацца ў мяса-малочным напрамку.

Тав. Дрозд, старшыня калгаса «Праўда» Кобрынскага раёна, у артыкуле «Сённяшняе, надзённае», надрукаваным у газеце «Літаратура і мастацтва» 10 кастрычніка 1959 г., выказаў правільныя думкі пра спецыялізацыю і канцэнтрацыю сельскагаспадарчай вытворчасці. Як паказаў вопыт работы калгаса «Праўда» і многіх іншых сельгасарцелей рэспублікі, рост вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і зніжэнне яе сабекошту ў многім залежыць ад умелага гаспадарання, усебаковага выкарыстання прыродна-эканамічных умоў у кожнай гаспадарцы. Партыя і ўрад далі тут калгасам неабмежаваныя правы і магчымасці. Гэта аўтар добра разумее і імкнецца больш правільна і рэнтабельна павесці далейшае развіццё калгаса. Аднак некаторыя довады ім недастаткова абгрунтаваны.

На мой погляд, не зусім правільнае сцвярджэнне тав. Дразда, што, маўляў, калгасу «Праўда» нязручна займацца вырошчваннем цукровых буракоў, што нібыта план вырошчвання буракоў калгасу навязваюць зверху. На думку тав. Дразда, кукуруза, кармавы лубін, бульба і сырадэля даюць лепшыя вынікі. Ці так гэта? Звернемся да фактаў.

У 1958 г. у Кобрынскім раёне сярэдняя ўраджайнасць цукровых буракоў з гектара была ў 3,5 раза вышэй, чым бульбы. На вытворчасць цэнтнера цукровых буракоў выдаткоўвалася 2,9 працадня, а бульбы—3,2. У выніку сабекошт цэнтнера цукровых буракоў быў 42 рублі, а бульбы — 89 рублёў.

Я цалкам згодзен з тав. Драздом, што пасевы кукурузы, лубіну, бульбы і сырадэлі неабходна пашыраць. Аднак разам з тым лічу, што павелічэнне плошчы цукровых буракоў — не менш важная задача. Вытворчасць іх у нашай рэспубліцы павінна павялічыцца за сямігодку ў 2,6 раза. Згодна аналізу гаспадарчай дзейнасці гэтага раёна, рэзервы і магчымасці для вырошчвання цукровых буракоў тут далёка не выкарыстаны. У мінулым годзе калгасы раёна засявалі 700 гектараў цукровых буракоў, або 2,4 працэнта ворыва. Гэтага вельмі мала.

Гаворачы пра спецыялізацыю калгаснай гаспадаркі, тав. Дрозд не звярнуў увагі ў сваім артыкуле на спецыялізацыю брыгад і жывёлагадоўлі. А гэта вельмі важнае пытанне для далейшага ўздыму калгасаў рэспублікі.

Вопыт і час падказваюць, што ў сувязі з ростам магутнасці калгасаў і іх недзялімых фондаў стаў мяняцца гаспадарчы профіль брыгады, павышацца культура гаспадаркі, яе механізацыя і электрыфікацыя.

Цяпер у калгасах рэспублікі — каля чатырох тысяч комплексных вытворчых брыгад. Гэта найбольш дасканалая форма арганізацыі працы, у адрозненне ад тых, якія былі ў дробных арцелях да іх аб'яднання. Ужо цяпер у вытворчасці многіх комплексных брыгад пераважнае месца займаюць прадукты жывёлагадоўлі. За сямігодку колькасць гэтых прадуктаў узрасце больш чым у два разы, прыкладна на столькі ж будзе павялічана і пагалоўе грамадскай жывёлы.

Таму выключна важнае значэнне будзе мець рацыянальнае размяшчэнне пагалоўя грамадскай жывёлы на тэрыторыі брыгад. Пры гэтым, як паказаў вопыт, асобныя віды і групы жывёлы неабходна канцэнтраваць там, дзе маюцца больш спрыяльныя прыродна-эканамічныя ўмовы для іх развіцця, для павелічэння прадуктаў жывёлагадоўлі з найменшымі затратамі працы і сродкаў.

Такая спецыялізацыя і канцэнтрацыя не парушаць развіцця гаспадаркі, а паспрыяюць росту тых яе галін, што найбольш зручныя для калгасаў і дзяржавы.

Усё гэта паспрыяе атрыманню большай колькасці прадуктаў жывёлагадоўлі. Мяса і малако будуць каштаваць значна танней.

М. ЦЯБУТ,
начальнік упраўлення па аргкалгасных пытаннях Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР.

ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ САМАДЗЕЙНАГА МАСТАЦТВА

У скарбніцы савецкай культуры вялікае месца займае самадзейнае мастацтва. Гэта заканамерна для краіны, дзе шматмільённыя працоўныя масы маюць найшырэйшыя магчымасці авалодваць ведамі, здабыткамі чалавечага розуму, дзе на службу народу пастаўлены школы і тэатры, бібліятэкі і музеі. У невычэрпных крыніцах жыцця бярэ сокі савецкая культура, яе жывяць, даюць ёй шпаркі рост народныя масы.

Вялікі размах народнай творчасці — адно з яркіх сведчанняў росквіту савецкай культуры.

У нас ужо даўно стала будзённай з'явай, што рабочыя гурткі ставяць на заводскай сцэне многаактовыя п'есы, што калгасныя хоры выступаюць па радыё, што ў вёсках будуюцца палацы культуры... Але які глыбокі сэнс у тым, што гэтыя з'явы сталі ў нас звычайнымі!

Сапраўды, непазнавальна змянілася культурнае аблічча нашай краіны, у недалёкім мінулым адсталай і непісьменнай.

Хіба не аб гэтым гаворыць, напрыклад, той факт, што ў сучасны момант калектывы мастацкай самадзейнасці Беларусі налічваюць звыш 230 тысяч удзельнікаў. Многія самадзейныя калектывы дасягнулі высокага выканаўчага майстэрства, дзесяці з іх прысвоена назва народных тэатраў.

З кожным годам у мастацкую самадзейнасць уліваюцца маладыя выканаўцы, ствараюцца новыя і новыя калектывы. Народ наш багаты талентамі. Гэта красамоўна пацвярджае агляд калгасна-саўгаснай самадзейнасці, які сёлета праводзіцца ў рэспубліцы.

Зараз ужо закончыліся раённыя агляды, праходзяць абласныя. Правядзенне агляду садзейнічае далейшаму ўздыму самадзейнай творчасці мас. Там, дзе партыйныя і савецкія арганізацыі па-сапраўднаму клапоцяцца аб развіцці мастацкай самадзейнасці, агляды прайшлі на высокім узроўні. Гэта можна сказаць пра агляды ў Краснапольскім, Нясвіжскім, Слуцкім і некаторых іншых раёнах. За апошні час у гэтых раёнах нарадзіліся новыя самабытныя калектывы.

Адметнай рысай сёлетняга агляду з'яўляецца тое, што ён адбываецца ў час высокага палітычнага і працоўнага ўздыму народа, які самааддана змагаецца за выкананне сямігадовага плана. Гэты ўсенародны ўздым зрабіў дабратворны ўплыў і на мастацкую самадзейнасць — на яе масавасць, на змястоўнасць яе работы. Больш увагі стала ўдзяляцца нацыянальнаму рэпертуару, вышукванню і папулярызацыі самабытных песень і танцаў.

Задача заключаецца ў тым, каб замацаваць і далей развіваць поспехі, дасягнутыя ў час падрыхтоўкі і правядзення аглядаў мастацкай самадзейнасці ў калгасах і саўгасах, раёнах і абласцях. Рэспубліканскі агляд, які адбудзецца ў канцы лютага наступнага года ў Мінску, з'явіцца заключным і ганаровым экзаменам не толькі для тых калектываў і асобных выканаўцаў, якія заваявалі права выступіць у сталіцы, а і для ўсёй шматтысячнай арміі аматараў самадзейнага мастацтва беларускай вёскі. Рыхтавацца да гэтага экзамена — значыць дабівацца таго, каб самадзейныя калектывы рэгулярна працавалі ў кожным калгасе і саўгасе, каб удасканальваўся іх рэпертуар і майстэрства, каб музыка і песня звінелі — не змаўкалі ў нашых клубах, аздаблялі жыццё працаўнікоў вёскі.

Праведзеныя на месцах агляды выявілі таксама нямала недахопаў у развіцці мастацкай самадзейнасці на вёсцы.

Усё яшчэ ёсць у нас раёны, дзе аб самадзейнасці ўспамінаюць толькі напярэдадні аглядаў, вынікам чаго з'яўляецца малалікасць калектываў і беднасць рэпертуару. Такая з'ява назіралася, напрыклад, у Зельвенскім і Рудзенскім раёнах.

Зрухі ў паляпшэнні рэпертуару ў нас ёсць, аднак жа нельга не сказаць, што ў радзе месц не праяўляецца належных клопатаў аб сучасным рэпертуары, аб прапагандзе лепшых узораў беларускай савецкай музычнай і песеннай творчасці. Гаворачы аб надзённым рэпертуары, трэба зрабіць папрок і ў адрас нашых пісьменнікаў і кампазітараў, якія яшчэ ў вялікім даўгу перад сучаснай тэмай і, на жаль, не заўсёды памятаюць пра мастацкую самадзейнасць. Інтарэсы развіцця народнай творчасці патрабуюць ад дзеячоў прафесіянальнага мастацтва самай пільнай увагі.

Шмат якія калектывы і асобныя выканаўцы выступалі сёлета на аглядах з тымі ж самымі нумарамі, што і летась і пазалетась. Назіралася таксама ў радзе месц адсутнасць жанравай разнастайнасці мастацкай самадзейнасці, нізкі ўзровень майстэрства выканання, пранікненне халтуры на сцэну. Некаторыя кіраўнікі самадзейнасці і работнікі органаў культуры не праяўляюць ініцыятывы ў вывучэнні бытуючых у іх раёнах народных песень і танцаў, каб за лік гэтых самабытных твораў узбагаціць рэпертуар калектываў. Многія праўленні калгасаў не аказваюць матэрыяльнай і арганізацыйнай дапамогі самадзейнасці.

Супраць гэтых і іншых недахопаў у развіцці самадзейнага мастацтва патрэбна рашуча змагацца. Неабходна штодзённа дбаць аб выхаванні народных талентаў, аб мэтанакіраванай дзейнасці гурткоў самадзейнага мастацтва, аб культурным адпачынку працаўнікоў вёскі.

Вялікія задачы вырашае савецкі народ, здзяйсняючы сямігадовы план. Гэта задачы і эканамічнага і культурнага будаўніцтва. На аснове развіцця народнай гаспадаркі на новыя вышыні ўзнімецца савецкая культура. Выдаткі на культурнае будаўніцтва ў гэтым сямігоддзі складуць у Беларусі, паводле планавых асігнаванняў Міністэрства культуры, 288 мільёнаў рублёў. А колькі сродкаў адпусцяць на гэта нашы калгасы і саўгасы! З уздымам эканомікі кожны год яны ўсё больш і больш увагі будуць удзяляць задавальненню растучых культурных патрабаванняў калгаснікаў і рабочых саўгасаў. Больш і больш будзе ў нас добраўпарадкаваных клубаў, бібліятэк. Усё гэта, бясспрачна, паспрыяе далейшаму росту культуры вёскі, росквіту талентаў. За гэта трэба змагацца — змагацца за паспяховае выкананне сямігодкі. А добрая арганізацыя мастацкай самадзейнасці ў кожным калгасе і саўгасе, на кожным прадпрыемстве, узорнае наладжванне культурнага абслугоўвання працаўнікоў горада і вёскі—гэта таксама ўклад у сямігодку.

Мастацкая самадзейнасць — важны сродак выхавання камуністычнай свядомасці, высокіх маральных якасцей і культуры савецкага чалавека-будаўніка камунізма.

Да новых поспехаў самадзейнага мастацтва!

Пасля заканчэння сярэдняй школы Генрыэта Аграновіч пайшла працаваць на швейную фабрыку імя Дзяржынскага ў Бабруйску. Яна абрала сабе спецыяльнасць швеі-матарысткі. І вось цяпер паспяхова авалодвае гэтай сціплай прафесіяй.

З першых дзён знаходжання на прадпрыемстве дзяўчына зацікавілася работай гурткоў мастацкай самадзейнасці і прыйшла ў клуб.

— Што табе больш па душы? — спыталіся сяброўкі.

— Хачу ў танцавальны калектыў...

Так Аграновіч стала актыўнай удзельніцай самадзейнасці, старанна вывучала тэхніку танца, пераймала вопыт сяброўак. І вось нядаўна яна ўдзельнічала ў канцэрце самадзейных артыстаў у рабочым клубе.

Цёпла сустрэлі гледачы выступленне танцораў. Генрыэта Аграновіч удзельнічала ў «Кадрылі» з оперы «Дзяўчына з Палесся», у «Лядкаўскай кадрылі».

На здымку: удзельніца танцавальнага гуртка **Г. Аграновіч.**

Фота Ул. Крука.

На сельскай сцэне

Калі сярод удзельнікаў мастацкай самадзейнасці Вілейскага раённага Дома культуры зайшла размова аб тым, каб паставіць на сцэне РДК спектакль «Барабаншчыца», хтосьці скептычна заўважыў:

— «Барабаншчыцу» ставіць? Такое пад сілу толькі прафесіянальным артыстам. Хіба ж мы здолеем?

— А давайце паспрабуем. Магчыма і выйдзе што-небудзь, — сказалі іншыя.

З прапановай згадзіліся ўсе члены драматычнага гуртка. Удумліва былі размеркаваны ролі, вызначаны дні рэпетыцый. Пачаліся дні напружанай і руплівай працы гурткоўцаў. І вось настаў час, калі ім патрэбна было трымаць перад гледачом творчы экзамен...

Галоўную ролю Нілы Сніжко памайстэрску выканала медработнік санэпідстанцыі Галіна Баброва.

Паспяхова выступіла ў ролі Тузікавай супрацоўніца Дома культуры Паліна Чабатар.

Прывабны вобраз дэмабілізаванага савецкага лётчыка Фёдара, які першым глыбока заглянуў у душу «барабаншчыцы», разгадаў у дзяўчыне сапраўдную савецкую гераіню-патрыётку, стварыў механізатар Вілейскай рамонтна-тэхнічнай машынна-меліярацыйнай станцыі Мар'ян Мацкевіч.

За дваццаць дзён калектыў паказаў пастаноўку ў райцэнтры Крывічы, у населеных пунктах Куранец і Ілья, і двойчы ў Вілейцы.

І. ПАНЦЯЛЕЕЎ.

Вілейскі раён.

Ганаровае званне

За актыўны ўдзел у прапагандзе беларускай мастацкай літаратуры Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР дырэктару літаратурнага музея Янкі Купалы тав. **Луцэвіч Уладзіславе Францаўне** прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР.

НА БУДОЎЛЯХ У НАС

Музыка Георгія УДАРАВА. Словы Міхася КАЛАЧЫНСКАГА



На будоўлях у нас
Золак рана ўстае,
І прыходзяць якраз
У брыгады свае
Цесляры,
Муляры,
Знатныя тынкоўшчыкі,
Страхары
Ды майстры
Цвёрдых спраў—
бетоншчыкі.

Зззяюць кельмы зарой
У руплівых руках:
Сталі дружнай сям'ёй
На высокіх пастах
Цесляры,
Муляры,
Знатныя тынкоўшчыкі,
Страхары
Ды майстры
Цвёрдых спраў —
бетоншчыкі.

Веюць сцюжы зімы,
З твараў коціцца пот,
Ды будуюць дамы
Аж на тысячу год
Цесляры,
Муляры,
Знатныя тынкоўшчыкі,
Страхары
Ды майстры
Цвёрдых спраў —
бетоншчыкі.

Многа зроблена спраў.
Гасне дзень пакрысе.
Баяніст заіграў,
І збіраюцца ўсе
Цесляры,
Муляры,
Знатныя тынкоўшчыкі,
Страхары
Ды майстры
Цвёрдых спраў —
бетоншчыкі.

Зорку ўзняў абеліск
З плошчы ў мірны блакіт.
Славіць радасны Мінск
Подзвіг, мужнасць і спрыт
Цесляроў,
Муляроў,
Маладых тынкоўшчыкаў,
Страхароў
Ды майстроў
Цвёрдых спраў —
бетоншчыкаў.

Карысная справа

У чытальнай зале Гомельскай абласной бібліятэкі арганізавана вялікая вітрына «Чытайце гэтыя кнігі».

У раздзеле «Новы ўздым сельскай гаспадаркі» прадстаўлена 28 розных выданняў кніг, у тым ліку «Матэрыялы XXI з'езду КПСС», вялікая праца «Партыя — арганізатар крутога ўздыму сельскай гаспадаркі СССР», брашуры, часопісы. Другі раздзел «Дарога да зорак» прысвечаны штучным спадарожнікам Зямлі, касмічным ракетам і праблеме палёту ў космас.

Важнаму пытанню камуністычнага выхавання працоўных прысвечаны раздзел «З гэтым пара канчаць». У ім брашуры і артыкулы пра шкоду алкаголю для здароўя чалавека.

Літаратуру, якая прадстаўлена на вітрыне, з цікавасцю праглядаюць наведвальнікі бібліятэкі.

Р. ЗАЙЦАЎ.

Пісьменнікі Рудзеншчыны

Такі загаловак мае вітрына, зробленая ў чытальнай зале Рудзенскай раённай бібліятэкі. Яна расказвае пра жыццё і творчую дзейнасць паэтаў і пісьменнікаў, якія нарадзіліся і працавалі на Рудзеншчыне.

Прыгожа аформлены стэнд змяшчае фотаздымкі, дае біяграфічныя даведкі і коратка расказвае аб літаратурнай дзейнасці Міхася Чарота, Макара Паслядовіча, Алеся Бачылы, Хвядоса Шынклера, Уладзіміра Хадыкі і другіх. Наведвальнікі бібліятэкі маюць магчымасць пазнаёміцца з творамі сваіх землякоў.

Р. КАРОТКІ.

У калгасным клубе

Новы клуб з глядзельнай залай на 360 месц адкрыўся нядаўна ў калгасе «Бальшавік» Шклоўскага раёна.

На ўрачыстым адкрыцці клуба з канцэртам мастацкай самадзейнасці выступіла агітбрыгада Коханаўскага тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі і Коханаўскага Дома культуры.

Асаблівым поспехам у гледачоў карысталіся песні ў выкананні Башлаковай, танцы ў выкананні Валасевіча і Міхальчанкі.

Я. ІСАКАЎ.

Што турбуе герояў

З разнастайнай дзейнасці старшыні калгаса драматург В. Лаўрэнцьеў у п'есе «Іван Буданцаў» («Яны працягваюць шлях») зацікавіўся праблемай яго ўзаемаадносін з людзьмі — як непасрэдна з калгаснікамі, так і з тымі, што імкнуцца дапамагаць сельскагаспадарчай арцелі ці перашкаджаюць яе развіццю. Сама пастаноўка праблемы, безумоўна, правільная. Калгасныя справы вырашаюць людзі, а з імі перш за ўсё даводзіцца працаваць старшыні. Важна гэта і таму, што калгасны кіраўнік павінен быць у кантакце з масамі і абараняць іх інтарэсы ў штодзённай працы. Гэта і можа зрабіць такі спрактыкаваны чалавек, як Іван Буданцаў. Ён больш за чвэрць веку працуе на гэтай пасадзе і робіць усё з душой. Такі чалавек можа ўзначаліць ініцыятыву калгасных мас, можа быць прыкладам для пераймання, нягледзячы на яго цяжкі і часам непакладзісты характар.

Прыкметна, што драматург добра ведае калгаснае жыццё. Ён зжыўся з гэтай тэмай. Яму ёсць што сказаць пра калгаснае сялянства. Пісьменнік назваў свой твор драмай. Драматычнае ў ёй тое, што кожная добрая справа ў жыцці нараджаецца не сама па сабе, а ў працэсе барацьбы з дрэннымі з'явамі, з поглядамі адсталых людзей.

Рэжысёр — народны артыст БССР Д. Арлоў правільна зразумеў п'есу і паставіў спектакль «Іван Буданцаў» у Бабруйскім тэатры ў плане псіхалагічнай драмы. Рэжысёр усю ўвагу канцэнтруе на раскрыцці характару Івана Буданцава, якому фактычна і прысвячаецца твор. А дапаможныя лініі сюжэта як у п'есе, так і ў спектаклі зводзяцца да таго, каб падкрэсліць уласцівасці багатай чалавечай натуры калгаснага кіраўніка.

Разам з тым пастаноўшчык раскрывае стылявыя асаблівасці драматычнага твора. У прыватнасці гэта датычыцца публіцыстычнасці падзей, якія раскрываюцца праз лёс герояў. Дадатнае ў працы рэжысёра і тое, што выканаўцы ствараюць ансамбль, які сцвярджае тую атмасферу калектыву, у якой фармаваўся, адшліфоўваўся характар Буданцава. Без гэтага асяроддзя нельга сабе ўявіць не толькі аблічча старшыні, але і радавых калгаснікаў. Раскрыццё падзей ідзе па ўнутранай лініі (праз сутыкненне характараў). У спектаклі адсутнічаюць традыцыйныя масавыя сцэны. Пастаноўшчык усю ўвагу звяртае на раскрыццё псіхалогіі герояў і іх ролі ў калгасным будаўніцтве. Вопытны і патрабавальны рэжысёр зрабіў спектакль кампактным, дзейсным, драматычна напружаным, кампазіцыйна зладжаным. Усяму гэтаму спрыяла цікавая п'еса, хаця яна і не пазбаўлена пэўных недахопаў.

Станоўчыя рысы Івана Буданцава раскрываюцца не адразу, а паступова, у дзеянні, ва ўзаемаадносінах людзей. Добра, што гэта зразумеў выканаўца. Першае з'яўленне Буданцава — Г. Лаўрова ў пачатку спектакля некалькі насцярожвае. Старшыня «яршысты», задумённы, разважлівы, а часам здаецца, што трохі замкнёны чалавек. У працэсе развіцця дзеі паступова пачынаеш разумець, чаму ён такі. Таму што ёсць людзі, якія мала дбаюць пра калгас, бо больш думаюць аб уласным дабрабыце, чым аб грамадскай справе. І вось гэты халадок, лёд у людзях імкнецца растапіць сваёй настойлівасцю, уласным прыкладам самаадданага калгаснага працаўніка строгі старшыня, якога лёс не песціў, а выхоўваў у даволі суровых умовах. Сыны загінулі на фронце ў час Вялікай Айчыннай вайны, дачка, не зразумеўшы бацьку, уцякла ў горад, дзе яе асабістае жыццё не вельмі ўдалося. Гэта факты, якія знаходзяцца па-за п'есай, але ўздзейнічаюць на лёс героя. Асноўны ж канфлікт у драме, як і ў спектаклі, — сутыкненне Буданцава з архітэктарамі. У спектаклі, і ў прыватнасці ў ролі Буданцава, падкрэсліваюцца клопаты старшыні аб калгасніках, аб грамадскай справе, аб будучым. Гэта надае вобразу, побач з рэалістычнай праўдзівасцю, рамантычны ўзлёт. Праўда, калі герой марыць аб будучым, выканаўцу непатрэбны тэатральна-пафасны тон. Аб гэтым трэба гаварыць больш пранікнёна і значна, бо і драматург тут скупы на словы.

Буданцаў — Лаўроў надзвычай чалавечны. Асабліва ён шчыры ў дачыненні да людзей, якіх любіць. І перш за ўсё гэта датычыцца моладзі. Магчыма, такія паводзіны абумоўлены тым, што ён балюча перажывае страту сваіх дзяцей. Таму так запамінальныя сцэны з Ціханавым, Дашай і Генадзем. Але найбольш задушэўныя сцэны адбываюцца ў яго з жонкай і дачкой. Бо і такі строгі чалавек, як Буданцаў, любіць ласку, рады, што дачка вярнулася ў сям'ю, ды яшчэ з унукам Алёшкам. Любоў да сыноў ён пераносіць на ўнука.

Менш пашанцавала ў п'есе вобразам партыйных работнікаў. Фармальна яны ў сюжэце займаюць належнае месца. Але калі гаварыць аб мастацкай функцыі, дык яны значна ніжэй нават некаторых бытавых вобразаў, якія павінны займаць у п'есе і ў спектаклі другарадную ролю. А праз іх і трэба было паказаць тую ролю, якую Камуністычная партыя адыгрывае ў кіраўніцтве калгасамі. Ушакову (артыст Н. Ярмоленка), як маладому сакратару нізавой калгаснай партарганізацыі, безумоўна, трэба вучыцца ў вопытнага Буданцава і ўплываць на яго. А гэтага якраз і не адчуваецца. Што датычыцца сакратара райкома партыі Якуціна (артыст А. Аркадзьеў), дык яго пазіцыя нейкага старонняга назіральніка зусім не зразумелая. Рэжысёр імкнуўся тое-сёе змякчыць, зрабіць узаемаадносіны Буданцава з партыйнымі кіраўнікамі больш цёплымі, але драматургічны матэрыял не заўсёды спрыяў гэтаму.

У п'есе і спектаклі вельмі добрая думка пра спалучэнне вопыта старэйшых калгаснікаў з практыкай маладых, уцягванне ў кіпучае жыццё маладых, задорных сіл. Буданцаў гэта разумее больш за астатніх, таму яго ўплыў у іх перавыхаванні значны, плённы.

Даволі каларытная фігура калгасніцы Дашы Грачовай. Артыстка Л. Федчанка іграе ролю з асаблівым захапленнем. У гэтым вобразе паказана няўрымслівая дзяўчына, якая ўрэшце знаходзіць сваё сапраўднае месца толькі ў калгасе, у працы. Асабліва ярка паказвае артыстка каханне сваёй гераіні да Ціханава і Генадзя. Аднак лінія яе сувязі з дачкой Буданцава не зусім зразумелая. Калі яны сяброўкі, дык чаму Даша так слаба ўплывала на яе, каб тая хутчэй памірылася з бацькам? У паказе ўзаемаадносін сяброўак не ўсё прадумана.

Валя (артыстка В. Дземянкова) — дачка Буданцава — чалавек упарты. Магчыма, яна, як і бацька, шукае ў жыцці свайго шляху і часам памыляецца. Але ў спектаклі яна выглядае сентыментальна-плаксівай, ад чаго вобраз губляе сваю мэтанакіраванасць.

Калі пра Лушу (артыстка Ю. Саевіч) можна сказаць, што яна цікавая, хаця ў яе і службовая функцыя ў спектаклі, дык пра Генадзя (артыст Н. Куц) і Нору (артыстка К. Смірнова) і гэтага нельга сказаць. Драматургам яны падключаны да сюжэту слаба, ды і выканаўцы мала падумалі над індывідуальнымі рысамі вобразаў.

У асноўным правільны малюнак вобраза маладога, нявопытнага архітэктара Ціханава стварае артыст Ф. Пуховіч. Але яму трэба больш пераканаўча паказаць развіццё вобраза.

Заганы, з якімі змагаецца Буданцаў, фактычна ўвасоблены ў дзвюх фігурах. Гэта бюракрат Задарожны і гарадская мяшчанка з архітэктурнай установы Сельгаспраекта Алена Фёдараўна. Выконваюць ролі вопытныя артысты П. Масцераў і Л. Мацкевіч. Найбольш ярка сатырычныя фарбы выяўлены ў Задарожнага. Гэты кіраўнік хаця і імкнецца быць уладарным і ўплывовым, але ён нікчэмны, абмежаваны і нават палахлівы. Камедыйны акцёр П. Масцераў, не перагружаючы ролю мастацкімі дэталямі, знайшоў дакладны малюнак вобраза Задарожнага.

Л. Мацкевіч амаль увесь час імкнецца трымаць вобраз на сатырычным накале, што іншы раз не зусім апраўдана. Алена Фёдараўна — сатырычны вобраз, але яго трэба падаваць больш тонка, мякка, а не рэзка гратэскава.

У цэлым жа спектакль «Іван Буданцаў»—карысны сцэнічны твор.

Трэба сказаць, што Бабруйскі тэатр знаходзіць свой рэпертуар не без цяжкасцей, але стварае яго правільным шляхам. Ён працуе з маладымі беларускімі пісьменнікамі, бярэ актуальныя творы сучаснай савецкай драматургіі, якія хвалююць гледача, а разам з тым і акцёраў.

Алесь ЕСАКОЎ.

Прэм'ера ў абласным тэатры

Калектыў Гомельскага абласнога драматычнага тэатра паказаў гледачам новую работу — спектакль «Кухарка» па п'есе А. Сафронава.

ВЯЛІКІ РОСТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

...ладосці ўзялася яна за справу, па-камсамольску перамагаючы цяжкасці першага знаёмства з фізічнай працай. Яе настойлівасць і шчырасць былі хутка заўважаны, і праўленне даручае Раісе Ганчаровай кіраўніцтва брыгадай з дваццаці даярак. Нялёгка было Раісе. Нехапала вопыту, каб не адстаць ад старэйшых членаў сваёй брыгады, а брыгадзір жа павінен і прыклад паказаць! Вытрымала экзамен. За дзевяць месяцаў надаіла ад кожнай сваёй каровы па 2 711 літраў малака. Праўда, за гэты час старэйшыя даяркі надаілі ўсё ж, безумоўна, больш, чым Раіса Васількова. Аляксандра Гаўрылаўна, напрыклад, надаіла па 3 080 літраў, Разанкова Варвара Канстанцінаўна—па 2 873 літры, Маркусенка Лідзія Яфрэмаўна—па 2 857 літраў. Аднак яны шчыра павіншавалі маладую даярку. Для маладой—гэта немалы поспех, казалі яны.—Ды і добра, што не ўсё адразу даецца. Менш зазнавацца будзе брыгадзір,—дадавалі жартам.

Нядаўна ў жыцці Раісы Ганчаровай адбылася вялікая падзея. Партыйная арганізацыя калгаса прыняла маладую даярку ў партыю. А напярэдадні Кастрычніка брыгадзе даярак Раісы Ганчаровай было прысвоена званне брыгады камуністычнай працы.

Вось так прыгожа пачала свой працоўны шлях маладая калгасніца Раіса Ганчарова.

Не магу яшчэ не дадаць, што Раіса не забывае і пра вучобу, яна мае цвёрды намер у наступным годзе паступіць вучыцца завочна ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію...

Калі я цяпер бываю ў сваім калгасе, я кожны раз заўважаю, як усё больш канкрэтнымі, усё больш індывідуальнымі, калі можна так сказаць, робяцца клопаты арцельнага калектыву аб сваіх працаўніках. Жывуць цяпер калгаснікі так, як ніколі не жылі раней: і хлеба хапае, і сала ёсць, і грошы водзяцца. Разам з багаццем прыйшла ў хаты і культура: святло, радыё, кніга, газета. Толькі вось хаты ў многіх калгаснікаў заставаліся старымі, пасляфрантавымі, злепленымі наспех. І прыемна бачыць, як з дапамогай калгаса вырастаюць то на адной, то на другой вуліцы добрыя, моцныя, прасторныя, светлыя хаты. Прыемна бачыць, што калектыў думае, не забывае і аб тых, хто ў маладзейшыя гады шмат папрацаваў для калгаса, а цяпер па старасці пайшоў на заслужаны адпачынак. Вось і сёлета, праходзячы міма хат вясковых старых, я бачу каля іх акуратна складзеныя стажкі сена. Што гэта за стажкі? Гэта, аказваецца, сена, выдзеленае для патрэб гаспадарак старых калгаснікаў.

— Што ж, кармоў мы нарыхтавалі многа. Вунь колькі стагоў настаўлена,—гаворыць Аркадзь Авяр'янавіч, шырока паказваючы на лугі за Сожам.—Ды кукурузны сілас. Ды бульба. Ды лубін-салодкі. Чаму ж не паклапаціцца аб дабрабыце калгаснікаў? І аб тых перш за ўсё, хто да самай старасці не шкадаваў сіл для калгаса...

Мудрая наша партыя камуністаў, вялікая ёй пашана і ўдзячнасць ад людзей за ўсё: і за вялікія здзяйсненні па пераўтварэнню ўсяго нашага агульнанароднага жыцця, і за маленькі, самы будзённы клопат аб простым чалавеку, працоўным сыне народа.

І таму з такім уздымам рыхтаваўся наш народ сустрэць чарговы Пленум ЦК КПСС. Усе мы ведаем, што баявы штаб Ленінскай партыі камуністаў прыме рашэнні, накіраваныя на новае павышэнне дабрабыту савецкіх людзей. Таму і хацелася кожнаму прыйсці да Пленума з найлепшым вынікам у сваёй працы, на сваім участку грандыёзнага фронта стваральных работ нашай эпохі. Дзейна рыхтаваліся да Пленума і калгаснікі сельгасарцелі імя Леніна. Даяркі далі абяцанне надаіць у сярэднім па 2 700 літраў малака ад кожнай каровы. Цяпер у жывёлаводаў задача—не знізіць надояў малака і ў зімовы перыяд, захаваць у добрым стане калгасныя статкі, дабіцца прыросту жывёлагадоўчых і птушыных ферм. Хапае клопатаў і ў будаўнікоў і механізатараў. Яны імкнуцца да таго, каб і зімой па магчымасці не спынялася іх праца. Словам, працоўнае жыццё ні на міг не спыняецца; яно, як сэрца ў здаровым арганізме, пульсуе рытмічна, ясна і дакладна.

Перад ад'ездам з вёскі я яшчэ раз з прыемнасцю праходжу па знаёмых вуліцах. Хоць і сіверна, а святочны дзень, і людзей на вуліцах хапае. Сустракаю знаёмага дзядзьку—Нічыпара Лявонавіча Васількова. Калісьці, помніцца, у школе ён яшчэ вучыў мяне правільна трымаць рубанак.

—Добры дзень, Нічыпар Лявонавіч.—Ён доўга прыжмурваецца знізу, углядаецца.

—Ціханавіч?—І моцна паціскае руку. Мы ідзём па вуліцы, дзе шмат новых зрубаў, новых хат пад шыферам, і я не ведаю, чые гэта хаты, а ён называе мне імёны, і я ўсіх успамінаю.—А вось і майго сына халупа,—кажа ён. І я гляджу: добрая сабе халупа! Чысты, як звон, домік пад шыферным дахам, абнесены акуратным частаколам з палісаднікам,—гэта ўжо домік новага сяла, новага планавання.

— Рад за вашага сына, Нічыпар Лявонавіч. За ўсіх рад!

— Так, Ціханавіч, змянілася ў нас дэкарацыя! Зусім змянілася дэкарацыя!—гаворыць ён.

І я думаю: а можа і сапраўды гэта добра сказана: дэкарацыя! Можа, усё жыццё і ёсць вялікі тэатр, тэатр жыцця, дзе кожная эпоха, кожнае пакаленне, кожная з'ява маюць свае дэкарацыі. І дэкарацыяй нашага часу ёсць вокамгненныя ракеты, што адрываюцца ад савецкай зямлі і ляцяць у космас, і зорнае неба, адкуль ідуць для ўсяго свету савецкія сігналы, а тут, на зямлі,— грандыёзныя гідраэлектрастанцыі, і панарамы бясконцых будоўляў, і новыя гарады, і новыя сёлы, і палі пад збажынаю, і сады паабапал дарог, і шахты, і вышкі тэлеантэн, і палацы, і кветкі... І радасна адчуваць, што ты—удзельнік падзей, што адбываюцца на роднай зямлі і ва ўсім свеце, і член вялікага дружнага калектыву, што творыць цуды на роднай зямлі.



Новыя работы мастакоў. Я. Красоўскі. «Рудавозы на прычале».

ПА СТАРОНКАХ ЧАСОПІСАЎ

АГУЛЬНАЕ І ПРЫВАТНАЕ

Нядаўна я прачытаў два апавяданні розных аўтараў і падумаў: дзеля чаго напісаны гэтыя творы? Хіба толькі дзеля таго, каб аддаць даніну патрэбнай тэме? Але ж сама па сабе тэма без загадзя ўбачаных і па-мастацку асэнсаваных дэталей, падрабязнасцей, прыкмет часу, без цвёрда акрэсленых адносін аўтара да жыццёвага матэрыялу — гэта проста балванка, з якой можна або вытачыць нешта каштоўнае і патрэбнае, або нарабіць гару стружак.

На кожным кроку ў жыцці пісьменнік можа сустрэць самы разнастайны матэрыял. Здаецца, працягні толькі руку і чэрпай з вялікай жыццёвай ракі факты, бяры што хочаш і колькі хочаш. Рака не абмялее, не высахне.

Для некаторых аўтараў любая прыватнасць ператвараецца ў самамэту і не суадносіцца з цэлым, гэта значыць, з той карцінай, якую задумаў стварыць аўтар. У аповесці, рамане, дзе рабочая пляцоўка для пісьменніка даволі вялікая, сярод мноства прылад, падсобных матэрыялаў, будаўнічага друзу не заўсёды заўважыш дробную дэтальку, якая часам і непатрэбна майстру. Іншая справа — апавяданне. Тут усё павінна ляжаць блізка і выкарыстоўвацца з максімальнай эканоміяй, не замінаючы ні аўтару, ні чытачу.

Дэталі, факты, падрабязнасці, з якімі сустракаешся ў апавяданні Уладзіміра Ляўданскага «Чорнае балота», апублікаваным у дзесятым нумары часопіса «Полымя», не ствараюць цэласнай карціны, бо выпадковае, другараднае, адзінкавае выдаецца за агульную праяву народнага жыцця. Некаторым неспрактыкаваным аўтарам звычайна здаецца, што вернасць дэталей абавязкова гарантуе і вернасць усёй карціны. Ёсць у іх і свая «неабвержная» логіка: маўляў, так бывае ў жыцці, мы нічога не выдумалі, не дадалі ад сябе. Так, яны нічога не дадалі ад сябе, не паклапаціліся аб адборы фактаў і іх мастацкім асэнсаванні, далі поўную адстаўку творчай фантазіі. У апавяданні Уладзіміра Ляўданскага нават і гэтага няма. І самі дэталі не вызначаюцца верагоднасцю, і карціны ніякай не атрымалася.

Аўтар ведаў, што Савецкая ўлада амніціравала многіх людзей, якія ў час фашысцкай акупацыі дапусцілі памылкі і злачынствы, а цяпер раззброіліся, перагледзелі свае пазіцыі і гатовы жыць сумленна. Гэта быў надзвычай гуманны, чалавечны акт. Але ніхто і ніколі не апраўдваў здрадніцтва, адшчапенства, варожай ідэалогіі. Амністыя не мае нічога агульнага з рэабілітацыяй. Вось і захацелася Уладзіміру Ляўданскаму падкрэсліць у апавяданні менавіта гэтую зусім правільную думку. Зроблена ж гэта так, што шчырым савецкім патрыётам, калгаснікам, былым франтавікам і партызанам прыпісаны садысцкія тэндэнцыі.

Падрабязна, з мноствам натуралістычных малюнкаў расказвае аўтар пра нейкага гугнявага Саўку, які ў час вайны стаў паліцаем, душагубам, нявечыў, забіваў, паліў старых і малых. Усе гэтыя аперацыі апісаны з дакладнасцю судовага пратакола, у храналагічнай паслядоўнасці, з паказаннямі сведак, з пералікам рэчавых доказаў. Ясна, што такім нягоднікам няма і не будзе апраўдання. Нічога, акрамя лютай нянавісці, яны не заслугоўваюць. Праявілася ж гэтая нянавісць у герояў апавядання так, што перастаеш верыць і аўтару, і ўсяму, што ён нам паведаміў.

У тым жа самым годзе, калі фашыстаў прагналі з беларускай зямлі, калгаснікі знайшлі ў студні тапельца. Калі яго выцягнулі, усе пазналі Саўку. Як трапіў Саўка у студню, ніхто не ведаў:

«...І куды яго нячыстая несла, свету б ён не ведаў. Пасля ўжо толькі да нас дайшло, што за два дні да гэтага ён прыходзіў ноччу ў Падгорную Слабаду да свайго брата, а той яго і на парог не пусціў. Ну, дык і цягнуўся некуды далей і, відаць, п'яны захацеў дастаць вады, ды паслізнуўся і паляцеў...»

Старшыня сельсавета сказаў тое, што адпавядала агульнаму настрою.

«Ну і што ж, сабаку сабачая і смерць... Толькі вы, мужчыны, закапайце яго».

Мужчыны збілі труну («Чалавек жа ўсё-такі», — гаворыць адзін з герояў апавядання), схадзілі на могілкі, выкапалі яму і павезлі хаваць тапельца. А на могілках у гэты час мітынгавалі жанчыны:

«— Вон адсюль брыдоту гэтую! Не дадзім зневажаць могілкі! Не пусцім! У балота нячыстую сілу, у балота! Няхай сабачая костка гніе там, дзе добрыя людзі не ляжаць!».

Саўку пахавалі на балоце.

Ну, што ж, мабыць такі выпадак мог быць у жыцці. Але ці тыповы ён для нашай савецкай рэчаіснасці, ці закранае ён якую-небудзь праблемную з'яву ў жыцці? Нянавісць да ворага, здрадніка, бязлітасная барацьба з ім, нянавісць да самой памяці аб здрадніку — гэта традыцыя народная. І ці варта было Уладзіміру Ляўданскаму апісваць «бунт» на могілках — здзек над трупам, прыватны выпадак, недарэчнасць, выключэнне з правіла. Захапляцца апісаннем падобных фактаў наўрад ці варта, бо яны не характэрны для нашага савецкага чалавека.

Нейтральнай паласы, нічыйнай тэрыторыі ў літаратуры сацыялістычнага рэалізма няма. На перадавых пазіцыях, у авангардзе барацьбы за камунізм баі заўсёды носяць наступальны характар. А ў наступленні, як вядома, няма месца нейтралізму, застойнасці, пазіцыйнай акопнай пасіўнасці, пры якой толькі і магчыма існаванне так званых нічыйных «пятакоў». Баявая актыўнасць уласціва ўсім жанрам савецкай літаратуры, і тым болей апавяданню, якое па сутнасці з'яўляецца разведкай новага і вызначаецца сваёй аператыўнасцю, чуласцю да малейшых змен у абстаноўцы, здольнасцю хутка і ўмела адгукацца на ўсё новае. Разведчык-апавядальнік не пацягне з сабою ў паход дальнабойную гармату або танк. З яго хопіць аўтамата, компаса, карты-двухвёрсткі, але карыстацца сваёй зброяй ён павінен асабліва разумна, каб не было халастых стрэлаў, непапраўных памылак. Нічога лішняга, разведанага іншымі, асвоенага папярэднікамі або сённяшнімі калегамі па пяру, апавяданне не цярпіць. Калі ж гэта вядомая ўсім дэталь, то яе з'яўленне ў творы можа быць апраўдана хіба толькі тым, што аўтар па-новаму ўбачыў яе, адкрыў нейкія дадатковыя адценні, грані, тэндэнцыі. Калі гэта хадавая, заштампаваная тэма, то зрабі ласку, знайдзі ў яе трактоўцы, яе вырашэнні нейкі новы, жывы змест, жывое гучанне, жывую інтанацыю.

Фама Клакоцкі сваё апавяданне «Карэспандэнцыя» («Беларусь» № 11 за 1959 год) прысвяціў надзённай тэме — жыццю і мірнай вучобе савецкіх воінаў. Усё, здаецца, у гэтым творы правільна, але прачытаеш яго і застаешся чымсьці незадаволеным.

На якіх дэталях і фактах пабудавана апавяданне? Першы факт: у артылерыйскае падраздзяленне прыязджае ваенны карэспандэнт і просіць аднаго з выдатнікаў напісаць артыкул пра сакрэт сваіх поспехаў. Артыкул атрымаўся не вельмі ўдалы. Тады салдат і карэспандэнт папрацавалі над ім разам; кожнае слова стала, як кажуць, на сваё месца. Другі факт: салдаты паверылі, што іх таварыш мае літаратурныя здольнасці і наперабой віншавалі яго: «Талент, талент у цябе, Мікіта!» І апошні штрых: прайшоў цэлы тыдзень, і ніхто больш не ўспамінаў пра артыкул і яго аўтара, і раптам з суседніх падраздзяленняў адна за адной сталі з'яўляцца дэлегацыі, каб пераняць вопыт выдатнага наводчыка. Значыць, артыкул саслужыў сваю службу.

З такіх дробных і нязначных прыватнасцей аўтар мерыўся стварыць карціну мірных будняў нашай арміі. Вядомая рэч, прэтэндаваць на шырокую карціну ў кароткім апавяданні ніхто не стане. Але і ў літаратуры малых форм, няхай сабе іншымі сродкамі, чым у рамане ці аповесці, павінна дасягацца такая мастацкая праўдзівасць і перакананальнасць, што і ў малым, у кроплі будуць адчувацца найбольш характэрныя асаблівасці акіяна народнага жыцця. Можна поўнасцю прыняць заўвагу Ю. Нагібіна, што і на невялічкім полі апавядання «трэба размясціць увесь бяскрайні свет, у якім жывеш; і бяздоннае неба, і прасторы зямлі, і ўнутраную «бясконцасць» чалавека, і самую душу нашага часу і нашай краіны...».

Што ж нам паказаў Фама Клакоцкі? Ролю армейскага друку ў прапагандзе лепшага вопыту? Не, гісторыя напісання карэспандэнцыі застаецца прыватнасцю, нязначным здарэннем. Спаборніцтва за дасканалае авалоданне баявой тэхнікай? Таксама не. Дух таварыскай узаемадапамогі? І гэтага не відаць. Чаму? Ды таму, што ў апавяданні адсутнічае сама сфера армейскага жыцця, не выяўлены думы і перажыванні сучаснага салдата, не стае жывой думкі. Стрэл атрымаўся халасты.

Мы гаварылі аб нейтральнай паласе, аб тым, што ў літаратуры сацыялістычнага рэалізма яе не павінна быць. На вялікі жаль, слабым месцам у нашай літаратуры застаецца апісанне быту людзей, таго, па словах Э. Багрыцкага, «матерого, желудочного быта земли», які нярэдка дае прытулак мяшчанству, эгаізму, карыслівасці і іншым агідным перажыткам мінуўшчыны. На гэтым тэматычным участку пануе зацішша, калі не лічыць адзіночных стрэлаў з снайперскіх засад. Прагучыць зрэдку такі стрэл, а потым зноў запануе непарушная цішыня. Мала, вельмі мала ўвагі аддаем мы праблемам быту, маралі, так званаму прыватнаму жыццю чалавека.

Сёння мяшчанства не мае ні такой сацыяльнай базы, ні такога грунту пад нагамі, як у гады нэпа. Тады яно крычала з вітрын прыватных магазінаў, нахабна лезла з барахолак, з розных закуткаў гешэфтмахерства, спекуляцыі. Тады ж і такім камбінатарам, як Астап Бэндэр, можна было разгортваць кіпучую дзейнасць. Цяпер мяшчанства загнана ў падполле і з'яўляецца рэцыдывам, перажыткам, анахранізмам, і туліцца яно ў шчылінках быту, імкнучыся, нібы тая мыш у качарэжніку, сядзець ціха і нічым сябе не выдаваць. Ад гэтага мяшчанства не становіцца нейтральным і бяскрыўдным, не змяняе сваёй варожай нам сутнасці, і яго трэба выганяць з апошніх прытулкаў.

На такія думкі, між іншым, наводзіць апублікаванае ў лістападаўскім нумары часопіса «Беларусь» апавяданне Аркадзя Чарнышэвіча «Калінішын зяць» — аб тым, як адзін сумленны, але не вельмі ўстойлівы чалавек сунуў мяшчанскаму чорту ў зубы палец і што з гэтага атрымалася. На гэты раз дробнаўласніцкае мяшчанскае кодла затаілася на хутары, далей ад людскога вока, ад кантролю грамадства, прыняўшы прывабнае аблічча маладой і прыгожай жанчыны, дачкі колішняга панскага лесніка, які ганарыўся сваім шляхецтвам і каталіцтвам. Гаспадар хутара ў час вайны загінуў ад партызанскай кулі, Калініха, хэць і апошняй, але ўступіла ў калгас, дачка, Надзя, скончыла сярэднюю школу і шукала прымака. Кожная дэталь у гэтым апавяданні нясе пэўную нагрузку.

Прыгадаем некаторыя з дэталей. Калініха выходзіла на работу кожны дзень і ўсяляк выдавала сябе за шчырую калгасніцу. Але многія ведалі цану гэтай уяўнай шчырасці: «Вакол хутара калгасныя палі: збажына, бульба, канюшына. Калініха не грэбавала нічым. Брала не памногу. Навучыла і дочак». Гэта — штрых з партрэта Калініхі. Яблычка недалёка ўпала ад яблыні. Надзя таксама не мінала нічога, што трапляла пад рукі: «Гэта было такое пранозаватае дзеўчанё, што магло з-пад курыцы яйка ўкрасці. І рабіла гэта так хараша і лоўка, што ніхто не мог і падумаць пра яе дрэнна. Прыгожая, сціплая, з мілымі вочкамі, заўсёды апушчанымі ўніз, яна нагадвала ляльку. «Не, гэта не Калінішына дочка», — думаў кожны, хто яе бачыў». Лагічна да гэтай групы дэталей належыць і такая: малады калгаснік Раман Хмель ледзь толькі прыйшоў з арміі і ўбачыў Надзю, думаў, што злавіў сваё шчасце. Але заўважце: калі Раман сказаў бацьку, што хоча ажаніцца з Надзяй, той доўга маўчаў, думаў і нарэшце сказаў: «— З Калінішынай дочкай...» Маці таксама была ўражана такой весткай: «Да Калініхі ў прымакі ідзеш, сынок?..»

Сілы расстаўлены і гатовы дзейнічаць у аднаведнасці з сваімі грамадскімі і чыста чалавечымі, асабістымі функцыямі, сваім жыццёвым прызваннем. Спачатку маладая была ласкавая і прыветная. «Рамана-

ТВОРЫ МАЛАДЫХ

Закончыўся семінар маладых дзіцячых пісьменнікаў, які праходзіў на працягу некалькіх дзён. У абмеркаванні творчасці маладых аўтараў прынялі ўдзел пісьменнікі Я. Маўр, І. Шамякін, Ус. Краўчанка, В. Вітка, А. Якімовіч, А. Пальчэўскі, С. Грахоўскі, Э. Агняцвет і іншыя. У ЦК ЛКСМ Беларусі адбылася нарада, прысвечаная вынікам работы семінара.

Друкуем творы ўдзельнікаў семінара.

Міхась ПАРАХНЕВІЧ.

Зімою

На двары стаіць мароз,
І шкада Сымону:
— Гусаку адмерзне нос —
Вунь які чырвоны.
А Сымону у адказ
Зазначае Нэля:
— Хай у хату йдзе да нас —
Нос яму б пагрэлі.

Ваверка

На крутым лясным пагорку
Скача шустрая ваверка:
— Як вясёлай мне не быць,
Калі выраслі грыбы!
Назбіраю я грыбоў,
Пасушу на сонцы.
Добра жыць сярод дубоў
У лясной старонцы!
Ах, як хараша наўкол,
Як тут шмат уцехі!..
Так і просяцца ў дупло
Спелыя арэхі.
Што з арэхамі рабіць?
Ажно гнуцца вецці...
Можа кошык папрасіць?..
Вунь бягуць з ім дзеці.

□

Іван ВЯРЫГА.

Сняжынкі

Выйшла з хаты ранкам Зіна.
Дзень марозны, а сняжынак —
Не злічыць і не сабраць,
І так ярка зіхацяць.
І падумала дзяўчынка,
Усміхнуўшыся сняжынкам:
— Гэта ноччу дзед Мароз
З неба зорачак натрос.

Вольга ІПАТАВА.

Добрай ночы

Ноч плыве над дзіцячым домам.
Моцна ў спальні малодшыя спяць.
А з кутка ў цішыні гэтай соннай
Толькі шэпт асцярожны чуваць.

Гэта нам, як старэйшым, не спіцца,
Мы паселі на ложку адным.
Хіба мала ёсць чым падзяліцца,
Паспрачацца, памарыць аб чым?

І пра вечар сягонняшні ў школе,
І каму пастунаць ў інстытут,
І што дом наш дзіцячы ніколі
Не забудзем, бо выраслі тут.

Непрыкметна праходзяць гадзіны...
Б'юць куранты. Нам спаць ужо час;
І здаецца, што гэта Радзіма
«Добрай ночы!» — жадае для нас.

□

Васіль КАРПЕЧАНКА.

Дзед і ўнук

— Дзедка, дзедка, галубок,
Пойдзем, дзедка,
На каток!

— Родны ўнучак,
Мала змогі —
Дрэнна слухаюцца
Ногі.

— Дзедка,
Там канькі дадуць —
Ногі
Самі пабягуць!

Васілёк і Пецька

Пецькам завуць пеўня, што жыве на нашым двары. Пецька заўсёды прачынаецца раней за хлопчыка Васілька. Ён спачатку палопае крыламі, а потым крычыць: «Ку-ка-рэ-ку!» — будзіць Васілька.

Так ужо ў звычку ўвайшло, што Васіль устае раніцою, бярэ жменьку зярнят і выходзіць на двор: сыпле зярняты на зямлю і чакае пеўня. Але той не спяшаецца. Ён спачатку кліча сваім заклапочаным «кох-кох-кох» усіх курэй са двара. І толькі тады разам з імі пачынае падбіраць зярняты.

У Васілька ёсць малодшая сястрычка Верачка, з якою ён заўсёды разам гуляе. Аднойчы мама прынесла з магазіна булку, адрэзала дзве роўныя лустачкі, намазала зверху варэннем і пачаставала дзяцей.

Выходзячы на двор, Верачка спатыкнулася, і ў яе булка выпала з рук. Дзяўчынка трошкі падумала, падняла лустачку і пакрышыла курам.

— Ага! У мяне ёсць булка з варэннем, а ў цябе няма! Ага! Ух, якая смачная! — хваліўся Васілёк.

— Дай мне кавалачак, — не вытрымала і папрасіла Верачка.

— Ого, чаго захацела! Нават і думаць кінь! — занярачыў Васілёк і заклаў руку з булкаю за спіну.

— Я ж табе ўчора арэхі давала,— ледзь не плакала Верачка.

— А я ў цябе і не прасіў, няхай бы і не давала...

Васілёк намерыўся сказаць яшчэ нешта, але не закончыў. Певень раптам моцна стукнуў дзюбай у лустачку, і булка выпала з Васількавых рук. «Кох-кох-кох-кох!» — клікаў певень да сябе курэй, каб раздзяліць з усімі сваю здабычу.

— Ага, — сказала Верачка, — так табе і трэба. Не будзь скнарай. Бачыш, пеўнік лепшы за цябе.

А Васілёк ці то ад сораму, ці то ад злосці пачырванеў і нічога не адказаў сястры.

М. ЗАЛЕСКІ.

НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

□ Адбылася сустрэча членаў літаратурнага аб'яднання пры абласной газеце «Гродзенская праўда» са слухачамі ўніверсітэта культуры раённага цэнтра Казлоўшчына. З чытаннем сваіх вершаў выступілі Я. Гладкоў, Д. Бічэль, М. Дуброўскі.

П. ЖЫБУТ.

□ У Дрысенскім раёне пачаў працаваць лекторый культуры. Прачытаны лекцыі — «Вобраз савецкага чалавека ў мастацкай літаратуры», «Жывапіс другой паловы XIX стагоддзя», «Асноўныя формы, жанры і выяўленчыя сродкі музыкі».

І. РУБІН.

КІНАРЭЦЭНЗІЯ Ў АБЛАСНОЙ ГАЗЕЦЕ

Шматгранная і кіпучае жыццё дае кінематаграфістам багаты матэрыял для стварэння хвалюючых твораў пра нашых герояў-сучаснікаў. І сапраўды, многія новыя фільмы радуюць шчырасцю і праўдзівасцю, вялікімі і светлымі ідэямі. Але, на жаль, час-ад-часу на экраны трапляюць кінатворы шэрыя, павярхоўныя, якія не вызначаюцца ні важнасцю тэмы, ні мастацкімі якасцямі. Вось чаму кожны фільм павінен быць аб'ектыўна ацэнены кінакрытыкай.

На старонках абласных газет можна часта сустрэць рэкламу на новую карціну. Але чытачы маюць права патрабаваць, каб у абласным друку сістэматычна публікаваліся і кінарэцэнзіі, у якіх былі б ясна акрэслены грамадскае значэнне і мастацкія якасці карціны, дадзены канкрэтны кваліфікаваны разбор рэжысёрскіх прыёмаў, пры дапамозе якіх выяўлена асноўная ідэя фільма.

У прагледжаных нумарах абласных газет (пачынаючы ад ліпеня гэтага года) яшчэ рэдка можна знайсці кінарэцэнзіі, якія б адпавядалі асноўным патрабаванням гэтага жанра. Толькі некаторыя аўтары імкнуцца неяк аналізаваць новыя працы нашых студый, спрабуючы даказаць нешта сваё, прапанаваць, а не апісваць, што зрабіў той ці іншы герой фільма. Больш-менш пастаянна выступаюць у ролі кінакрытыкаў І. Міхайлава («Гродзенская праўда»), Л. Каліноўская («Магілёўская праўда»), М. Астапенка («Мінская праўда»). Яны імкнуцца глыбей пранікнуць у змест фільма, раскрыць яго сутнасць, выказаць меркаванні наконт ігры акцёраў, работы рэжысёра і аператара.

Рэдакцыі ж паасобных газет («Чырвоны сцяг», «Магілёўская праўда») увогуле рэдка друкуюць кінарэцэнзіі, замяняючы іх невялічкімі заметкамі статычнага характару аб прэм'ерах бягучага месяца.

Перад намі матэрыял С. Семяненкі «Фільм аб маладым пакаленні рабочага класа» («Мінская праўда» за 4 жніўня), у якім аўтар, відаць, хацеў прарэцэнзаваць фільм «Калі пачынаецца юнацтва». Карціна расказвае аб нашай цудоўнай савецкай моладзі, аб першых кроках яе самастойнага жыцця, аб сіле рабочага калектыву. Карціна цікавая, хаця ў многім і спрэчная. Перад кінарэцэнзентамі адкрываліся магчымасці дэталёва пагаварыць пра выбар акцёраў, пра наіўнасць і штучнасць некаторых сцэн, пра аператарскую працу. Але замест гэтага С. Семяненка сумна пераказвае змест карціны. У апошніх некалькіх радках ён паспешліва паведамляе: «Аўтары сцэнарыя Вадзім Сабко і Анатоль Слесарэнка праўдзіва і маляўніча паказалі жыццё маладога пакалення рабочага класа.

Заслугоўвае ўвагі ігра артыста Сяргея Дварэцкага (Іван Сакаленка), маладой кінаактрысы Святланы Данільчанкі (Саня), Паўла Малчанава (Граменка) і іншых, якія стварылі запамінальныя вобразы прадстаўнікоў маладога і старэйшага пакаленняў рабочага класа. Фільм «Калі пачынаецца юнацтва» будзе станоўча ацэнены і цёпла сустрэты савецкімі гледачамі».

Чаму станоўча? Карыстаючыся якімі мастацкімі сродкамі артысты стварылі запамінальныя вобразы? На гэтыя пытанні артыкул адказу не дае. Што ж атрымае чытач з гэтага матэрыялу да прагляду фільма? Сухі пераказ у многа разоў цікавейшай карціны. Што атрымае ён пасля прагляду фільма? Доўгае апісанне сюжэта кінатвора.

Нельга залічыць да жанра маленькага творчага даследавання і матэрыял М. Якаўцавай «Праўда і мужнасць», змешчаны ў газеце «Чырвоны сцяг» ад 15 верасня, бо аўтар выдае сваё звычайнае пісьмо аб тым, як яна зразумела фільм «Жорсткасць», за крытычны разбор твора. Не хвалюе і матэрыял А. Шабаліна «Фільм, які сцвярджае жыццё» (з гэтай жа газеты ад 13 кастрычніка).

Мы ўсё больш пераконваемся, што большасць абласных кінарэцэнзентаў не разумеюць сваёй ролі. Яны не імкнуцца падрабязна абмяркоўваць фільм, а катэгарычна і бяздоказна асуджаюць ці хваляць яго. На самай жа справе трэба разбіраць кінатвор грунтоўна, усхвалявана і рознабакова.

У кінатворы асноўны сродак выяўлення задумы аўтара — не слоўнае апісанне, а ігра акцёраў, праца рэжысуры, аператара, якасць музычнага афармлення. Ад таго, наколькі ўдалым будзе ўсё гэта, залежыць поспех фільма ў гледача. Пра гэта ў першую чаргу і павінен пісаць крытык. На жаль, часцей сустракаеш адны адпіскі, накшталт таго, што «...трэба адзначыць артыстаў А. Воўсі (хірург), Ю. Фамічова (санітар Сямёныч), В. Захарчанка (Фішар), якія знайшлі патрэбныя фарбы для абмалёўкі сваіх герояў» («Першы дзень міру». «Зара» за 18 кастрычніка) або «Добрая ў фільме аператарская работа (аператар В. Масевіч)» («Чырвоны сцяг» за 13 кастрычніка).

Нашы крытыкі не вызначаюць, наколькі па-новаму вырашана творчая задача, што стаяла перад аўтарам фільма. Мастацтва ж не церпіць паўтораў. Як правіла там, дзе паўторы, канчаецца творчая думка. І такія сігналы крытыкаў былі б вельмі каштоўнымі для майстроў кіно.

Нам здаецца, трэба смялей укараняць новыя формы рэцэнзавання карцін. Паколькі кінарэцэнзія мае ў сабе элементы прапагандысцкага артыкула, нарыса і рэферата, дык няхай кожны раз у залежнасці ад матэрыялу і мастацкай карціны пішацца і рэцэнзія. Хай будзе больш кінааглядаў, нататак гледачоў, ацэнак фільма вядомымі артыстамі, урачамі, навуковымі супрацоўнікамі, наватарамі вытворчасці і перадавікамі сельскай гаспадаркі. Але заўсёды трэба пазбягаць павярхоўнага апісання карціны пад выглядам кінарэцэнзіі. Такія матэрыялы не нацэльваюць гледачоў на лепшыя работы кінематаграфістаў, не дапамагаюць работнікам кіно ўдасканальваць сваё майстэрства, павышаць ідэйную і мастацкую якасць фільмаў.

Выклікае вялікае здзіўленне, што амаль усе рэдакцыі абласных газет (нейкае выключэнне — «Мінская праўда») не друкуюць матэрыялаў пра дакументальныя і навукова-папулярныя фільмы.

Трэба дабіцца, каб на старонках газет друкаваліся змястоўныя і абгрунтаваныя крытычныя артыкулы на новыя творы кінамастацтва. У сувязі з гэтым узнікае пытанне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных аўтараў кінарэцэнзій. Цяпер, калі ў рэспубліцы створаны Саюз кінематаграфістаў, гэтая праблема можа быць вырашана. Трэба дамагчыся, каб за семінарамі кінадраматургаў, кінааматараў паследавала і творчая вучоба журналістаў, што спецыялізуюцца па кінакрытыцы. Такая вучоба прынясе, безумоўна, станоўчыя вынікі.

Р. ЯСІНСКІ,
рэдактар кінастудыі
«Беларусьфільм».

Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя ЛКСМБ паказаў жыхарам горада новы спектакль «Схаваны кабальера». Вясёлая камедыя вялікага іспанскага драматурга Кальдэрона насычана трагіка-камічнымі сітуацыямі. Гледачы з неаслабнай увагай сочаць за дзеяннем на сцэне. Рэжысёр-пастаноўшчык новага спектакля Г. Волкаў і выканаўцы імкнуцца да таго, каб данесці да гледачоў своеасаблівасць і нацыянальны каларыт п'есы.

На здымку: сцэна са спектакля «Схаваны кабальера». У галоўнай ролі дона Карласа — заслужаны артыст Літоўскай ССР **А. Логінаў** (злева), у ролі яго слугі Маскіта — заслужаны артыст БССР **Б. Уксусаў**.

Фота **В. Германа**. (БЕЛТА).

Летапісец народнага побыту

22 снежня споўнілася 125 год з дня нараджэння выдатнай украінскай пісьменніцы Марка Ваўчок (Марыі Аляксандраўны Вілінскай-Марковіч).

Нарадзілася яна ў вёсцы Екацярынінскай Ялецкага павету Арлоўскай губерні. Адукацыю атрымала ў Харкаўскім пансіёне, пасля пасялілася ў г. Арле, дзе збліжалася з выдатнымі прадстаўнікамі мясцовай інтэлігенцыі—М. Лясковым, П. Якушыным, славянафілам П. Кірэеўскім, этнографам А. М. Марковічам (які пасля стаў яе мужам) і іншымі перадавымі дзеячамі таго часу.

Доўгі час М. Ваўчок пражыла на Украіне сярод простага працоўнага народа. Тут яна шмат увагі аддала вывучэнню фальклору, творчасці выдатнага ўкраінскага кабзара Т. Шаўчэнкі, рускай і замежнай класікі, вывучэнню побыту прыгоннага сялянства, яго мовы і культуры. Усім сэрцам яна палюбіла гэты прыгнечаны народ, і лепшыя свае творы яна прысвяціла барацьбе за адмену прыгоннага права, барацьбе за інтарэсы шырокіх народных мас.

У 1856 г. з'явіўся ў друку яе першы твор «Народныя апавяданні», прысвечаныя жыццю і побыту працоўнага ўкраінскага народа. Гэтая кніга, якая выйшла потым асобным выданнем на рускай мове ў перакладзе выдатнага пісьменніка Івана Сяргеевіча Тургенева, прынесла ёй прызнанне і вялікую ўдзячнасць з боку перадавой рускай і ўкраінскай інтэлігенцыі.

У «Народных апавяданнях», напісаных жывой украінскай народнай мовай, Марка Ваўчок адлюстравала трагедыю прыгоннага сялянства, стварыла вобразы паднявольных прыгонніц-жанчын, якія імкнуліся да вызвалення ад памешчыцка-дваранскага эканамічнага і нацыянальнага прыгнёту.

Гэтую кнігу Марка Ваўчок вялікі кабзар украінскага народа Т. Шаўчэнка назваў «натхнёнай кнігай».

Апавяданні М. Ваўчок мелі выключны поспех сярод шырокай рускай грамадскасці і атрымалі станоўчую ацэнку Д. Пісарава, М. Дабралюбава, А. Герцэна і М. Чарнышэўскага.

У 1859 годзе выйшла другая кніга М. Ваўчок «Апавяданні з народнага рускага побыту», якая таксама прасякнута ідэямі барацьбы за вызваленне прыгоннага сялянства.

З 1859 па 1867 год Марка Ваўчок знаходзіцца за мяжой на лячэнні. Але і там яна не парывае сувязі з рэвалюцыйнай дэмакратыяй і рускімі рэвалюцыянерамі-эмігрантамі Герцэнам і Агаровым. За мяжой яна таксама займаецца літаратурнай дзейнасцю. Там была створана яе вядомая аповесць «Лялечка», напісаны таксама апавяданні на рускай і ўкраінскай мовах.

Пасля вяртання з-за мяжы сувязі пісьменніцы з рэвалюцыйнай дэмакратыяй яшчэ больш умацаваліся. Яна піша і друкуе вядомыя свае казкі для дзяцей, новыя апавяданні, выступае з аповесцямі і раманамі — «Жывая душа» (1868), «Цёплае гняздзечка» (1873), «У глушы» (1875) і іншымі. У гэтых творах Марка Ваўчок стварыла каларытныя вобразы прадстаўнікоў тагачаснай разначыннай інтэлігенцыі.

Тарас Шаўчэнка высока цаніў творчасць Марка Ваўчок і захапляўся ёю.

«Апавяданні Ваўчка яшчэ не атрымаў»,—піша ён у лісце да ўкраінскага пісьменніка П. Куліша 4 студзеня 1858 года. А праз некалькі дзён піша М. Лазарэўскаму: «Марка Ваўчок—гэта псеўданім нейкай пані Марковіч. Ці не ведаеш ты яе адраса? Калі не ведаеш, то запытай у Камянецкага, у друкарні Куліша. Я чуў, што ён яе добра ведае. Калі даведаешся, то напішы мне: трэба будзе хоць у лісце падзякаваць ёй за яе сардэчныя, шчырыя «Апавяданні».

Асабіста Т. Шаўчэнку з М. Ваўчок пазнаёміцца не ўдалося; у пачатку 1859 года яна выязджае за мяжу, а вяртаецца тады, калі Шаўчэнкі ўжо не было. Але яны падтрымлівалі пісьмовую сувязь да канца яго жыцця. У лісце да М. Ваўчок ад 25 мая 1859 года Тарас Шаўчэнка звярнуўся да яе з бацькоўскімі словамі: «Дзякуй табе, мая любая дачушка, мая адзіная, што ты мяне хоць у Дрэздэне ўспомніла. Я яшчэ і дагэтуль тут, не пускаюць дадому. Друкавацца не дазваляюць. Не ведаю, што і рабіць. Ці не павесіцца часам? Не, не павешуся, а ўцяку на Украіну, ажанюся і вярнуся, як умыты, у сталіцу. Калі вы вернецеся да нас? Калі б праз год, то дужа добра было б. З Кажанчыкавым я пабачыўся пазаўчора, і ён мне нічога не сказаў пра «Лядашчую» (апавяданне М. Ваўчок). Сэрцайка маё! Не пасылайце пакуль што нічога гэтым кнігарам—пакуль вас ліха не прыцісну ла. Бо яны не бачаць, а носам чуюць нашу беднасць. А між тым, рабіце, як самі знаеце. Восенню будзе ў мяне свой часопіс пад рэдакцыяй Белазёрскага і Макарава. Пачакайце крышку. А пакуль што няхай вам бог дапамагае на ўсё добрае. Тройчы цалую вас...»

Колькі ў гэтых словах выказана пачуцця любві і павагі да выдатнай, сціплай і працавітай пісьменніцы. Ён называў яе «выкрывальніцай лютых і ненасытных».

Марка Ваўчок памерла ў 1907 годзе. Другі выдатны ўкраінскі песняр Іван Франко ў сваім некралогу ставіў імя М. Ваўчок у адзін рад з імёнамі барацьбітоў за свабоду і чалавечыя правы прыгнечаных народных мас.

Імя Марка Ваўчок дорага для ўсіх савецкіх народаў, для ўсёй нашай літаратуры. Творы яе шырока папулярныя сярод удзячных савецкіх чытачоў.

Н. ПЯТРОЎ.

Пры Мінскім гарадскім Доме працоўных рэзерваў трэці год працуе драматычны гуртон. Ім кіруе заслужаны артыст БССР З. Стома. У гуртку займаюцца вучні школ і вучылішчаў працоўных рэзерваў. У рэпертуар калектыву ўваходзяць п'есы «Паўлінка», «Бяда ад пяшчотнага сэрца», «Мы смела ў бой пойдзем». Нядаўна аматары самадзейнасці выступалі перад мінскімі тэлегледачамі. Яны паказалі аднаактовы спектакль «Хірургія» па апавяданню А. Чэхава.

На здымку: З. Стома (справа) дае парады **В. Допкюнасу** і **К. Сцяпанаву** перад выступленнем па тэлебачанню.

Тэкст і фота **Э. Рысаева.**

вы бацькі не маглі нацешыцца ёю. Не яны дагаджалі ёй, а яна ім». А потым ваўчыцу пацягнула ў лес. Пасля кожнага візіту Калініхі Надзя нудзілася, плакала, цэлыя дні ні з кім не размаўляла, адмаўлялася есці. Калі Раман сказаў, што ніколі не пакіне калгас і ёй таксама прапанаваў ісці на работу, вочы Надзі «затуманіліся і адзічэлі: здавалася, што яна нічога не бачыць і не чуе». Надзя вярнулася на хутар, выкарыстаўшы сваю цяжарнасць, як прынаду, але ўжо тады задумаўшы зрабіць аборт. Яна ведала, што сумленне не дазволіць Раману кінуць жонку ў такім стане. Раман здаўся і стаў прымаком на хутары. Яму залівалі вочы самагонкай, і чалавек паступова апускаўся ніжэй і ніжэй.

На гэтым можна было б паставіць кропку. Што ж, у жыцці так бывае, быў чалавек як чалавек, а потым ён па слабасці характару залез у мяшчанскае балота і там застаўся. Тады гэта быў бы прыватны выпадак, а пісьменніка цікавіла не выпадковасць, а агульная тэндэнцыя. Агульнае ж заключаецца ў тым, што Раман — калгаснік, і аднавяскоўцам, калектыву, зусім не абыякава, як складаецца лёс такога чалавека. Агульнае і ў тым, што хутар Калініхі блакіраван з усіх бакоў і дажывае апошнія дні. Калгас змагаецца за Рамана. Па-бацькоўску павучае яго старшыня, рэжуць праўдуматку таварышы па рабоце. Нават тое, што яго сталі называць не Раманам, а Калінішыным зяцем, не магло не насцярожваць чалавека. Перамог калектыў. Самагоншчыцам і спекулянткам не ўдалося ператварыць сумленнага калгасніка ў свайго парабка. Праўда дэталей злілася з праўдай цэлага, праз прыватнае паказана агульнае.

З усяго, што надрукавана ў апошні час у часопісах, добра запомніліся яшчэ апавяданні «Кірык» Міколы Лупсякова і «На новым месцы» Рыгора Рэлеса. На маю думку, гэтыя творы ўпрыгожылі раздзел прозы адзінаццатага нумара часопіса «Полымя» і не застануцца незаўважанымі. У абодвух выпадках праз старанна і абдумана выбраныя дэталі быту праступае вялікі свет глыбокіх чалавечых пачуццяў, угадваюцца шырокія гарызонты, якія адкрываюцца за непасрэднай арэнай дзеяння герояў. Праўда, Мікола Лупсякоў умее больш тонка перадаваць і агульны настрой і асабістыя перажыванні герояў, карыстацца ўскоснымі падрабязнасцямі, якія адкрываюць у прадметах новыя, часам зусім нечаканыя адценні. Рыгор Рэлес аддае перавагу лабавым прыёмам, тым не менш і яго апавяданне вабіць навізной, арыгінальнасцю.

Малы хлапчук Кірык з аднайменнага апавядання Міколы Лупсякова гуляе з аднагодкамі на беразе Дняпра. На другім беразе працуюць касцы. Аўтар прыводзіць нязначную, здавалася б, дэталь: «За Дняпром луг касілі касілкамі; косамі працавалі толькі адзінокія касцы — блізка ля крыніц або ў лагчынах». Дзеці ж на гэтым баку, гуляючы ў касцоў, «працавалі» толькі косамі: яны «збівалі кіямі кволае конскае шчаўе, і злева ад іх атрымлівалася нешта накшталт пракосу». Завадатар гульні Кірык запісаў усім па працадню. Адчуваецца, што ў калгасе багата тэхнікі, што працадзень тут аўтарытэтны і важкі, інакш дзеці знайшлі б другую гульню.

Кірык пахваліўся таварышам, што можа праглынуць злоўленага на лузе коніка, і зрабіў гэта. І зноў адчуваеш, што гэты, нібыта і дробны, факт вельмі патрэбны, каб выявіць цэлую гаму дзіцячых пачуццяў, бо ў спрэчцы аб тым, спявае ці не спявае конік у Кірыка ў жываце, угадваюцца самыя розныя характары ўдзельнікаў гульні. Маці злуе на Кірыка за яго непаседлівасць, але варта было хлопчыку спытаць, калі прыйдзе бацька, і жанчына раптам падабрэла, шчасліва ўсміхнулася. Хіба мала гэтага, каб чытач зразумеў, што перад ім дружная сям'я, дзе ўсе жывуць адным інтарэсам? Або такое. Даведаўшыся, што Кірык праглынуў коніка, маці гаворыць яму:

«— Ну ж і малайчына ты, Кірык! Калі ўжо ў цябе ў жываце конік заспяваў, дык давядзецца табе прапалоць усе грады. Аднак сёння хопіць. Ідзі пагуляй да вечара... Бегай, падрастай хутчэй».

З усяго гэтага без аўтарскай падказкі чытачу перадаецца адчуванне паўнаты жыцця, і не павісаюць у паветры аўтарскія словы аб тым, што жыццё як бы ўлівалася ў Кірыка, нагадваючы для яго непаўторную вясну, выкліканую смачнай і сытай ежай, радаснымі размовамі дарослых аб сямігоддзі, аб багацці і працаднях. А ўсё разам узятае — гэта майстэрства, уменне асэнсоўваць жыццёвыя з'явы так, што кожная дэталь служыць цэламу.

Апавяданне Рыгора Рэлеса «На новым месцы» паказвае, што людзі, якіх мы часам лічым непрыкметнымі і нават нічым не цікавымі, пры больш уважлівым знаёмстве раскрываюцца па-новаму і становяцца вельмі цікавымі і душэўна багатымі. У падтэксце гэтага апавядання ўгадваецца думка, што дарэмна мы называем нашых рабочых, калгаснікаў, прадстаўнікоў малапрыкметных прафесій простымі людзьмі. Гэта людзі вялікай душэўнай шчодрасці, вернасці грамадскаму абавязку, калектыву. У добрым калектыве, і гэта па-мастацку даведзена аўтарам, выпростваюцца і людзі з пэўнымі хібамі ў характары. Нездарма ж пад уздзеяннем таварышаў па рабоце становіцца больш сціплай і чалавечнай гераіня апавядання Ганна Пятроўна, якая раней думала толькі аб матэрыяльнай выгодзе.

Важна, каб кожнае слова, кожная дэталь у апавяданні былі не самамэтай, а сродкам раскрыцця чалавечых характараў у іх няспынным развіцці. Тады і ў малым будзе адлюстроўвацца вялікае.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

Пятро ВАСІЛЕЎСКІ.

Сумленне загрызла

КАМЕДЫЯ Ў АДНОЙ ДЗЕІ.

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:
НАТАША.
КУЗЬМА.
КЛАВА.
ЗІНА.
МАР'Я.
ПЕРАПЕЧКА.

Палявы простор. Пад павеццю—бочка з вадою, некалькі веласіпедаў і матацыклаў. Над залацістым ільняным полем лунае дзявочая песня.

Паказалася разамлелая ад гарачыні Наташа. Следам за ёй цягнецца Кузьма.

КУЗЬМА (*трагічна*). Сільва, ты мяне не любіш...

НАТАША (*грозна*). Якая я табе Сільва?

КУЗЬМА. Ці я кажу, што гэта ты? Гэта мастацкі фільм. Вельмі даўні. Таму і ідзе ў нашым клубе...

НАТАША. І няхай ідзе. А я не пайду. Бач ты яго! Выдумаў... Сільва!..

КУЗЬМА. А што? (*Раптам заспяваў*). Красоткі, красоткі, красоткі кабарэ! А? Сіла?

НАТАША. З глузду з'ехаў!

КУЗЬМА (*уздыхнуў*). Каханне.

НАТАША. Бачу я тваё каханне...

КУЗЬМА (*сумна*). Сільва, ты мяне не любіш... Сільва, ты мяне загубіш...

НАТАША. Гэтага не хапала! Няхай цябе Клава Цярэшка любіць і губіць.

КУЗЬМА. Сільва!

НАТАША. Змоўкні! Чуеш?

КУЗЬМА. Колькі разоў табе гаварыць, што камбайнёр Кузьма Лыкаў — асоба маленькая. Куды старшыня калгаса пашле, там і працуе.

НАТАША. Дык чаму ж цябе ў нашу брыгаду не паслалі?

КУЗЬМА. А пры чым тут я? Пытай у старшыні...

НАТАША. Няма чаго мне ў яго пытаць. Сама ведаю...

КУЗЬМА. Тым лепш!

НАТАША. Тым горш. Для цябе, мой галубок. Для цябе.

КУЗЬМА. Чаму?

НАТАША. Таму. Толькі ўсё роўна не быць Клаўцы першай у гэтым годзе, колькі б ты з даражэнькім старшынькам, з нашым Перапечкай, ля яе ні завіхаліся... Нічога не будзе!

КУЗЬМА. А я і не завіхаюся! Далібог!

НАТАША. А! Далібог! Значыцца, брэшаш!

КУЗЬМА (*пакорліва*). Брашу. Але ж зразумей! Каму не хочацца быць адзначаным узнагародай? Каму? А гэта ж калі Клава Героя атрымае, дык і нам ордэны... Ці ты б адмовілася?

НАТАША. Ад ордэна, вядома, не, а ад цябе магу адмовіцца.

КУЗЬМА. Наташа, верыш, прасіўся сёння ў тваё звяно.

НАТАША. Прасіўся?

КУЗЬМА. Ага! А старшыня кажа—ніякай працы не будзе, адно каханне... Вось, кажа, калі пажэнімся, тады іншая справа...

НАТАША. Бач, чаго захацеў! Вось я цябе зараз ажаню! (*Хапае ламачыну, замахваецца, але Кузьма спрытна заключае яе ў абдымкі*). Пусці! Кажу табе, пусці. Жаніх недаспелы...

КУЗЬМА. Чаму недаспелы? (*Цалуе Наташу*).

НАТАША. Як табе не сорамна! Людзі працуюць, а мы...

КУЗЬМА. І мы працуем! Вось у кузню іду...

НАТАША. Пачакай... Дык што—камбайн стаў?

КУЗЬМА. Нічога страшнага! Адна нага тут—другая там, і камбайн пайшоў! Нязначная паломка...

НАТАША. Кажаш, нязначная... Але ж яна магла быць і значная?

КУЗЬМА. Ціпун табе на язык.

НАТАША. Паслухай, Кузьма... Вось я чытаю цікавую кніжку...

КУЗЬМА. Пра каханне?

НАТАША. Ага! «Дон-Кіхот» называецца... Дык гэты рыцар у гонар сваёй Дульцынеі ўсялякія подзвігі рабіў...

КУЗЬМА. Хочаш, каб я таксама зрабіў подзвіг у імя Наташкі-пташкі?

НАТАША. Каб жа ты быў на гэта здольны!

КУЗЬМА. А чаму няздольны?

НАТАША. Зірніце на яго! Новы Дон-Кіхот з'явіўся!

КУЗЬМА. І з'явіўся! Вось, хочаш, да вечара ўвесь Клаўчын участак агалю? Тры нормы дам! Хочаш?

НАТАША. Можа, дасі... Толькі ж гэта подзвіг у гонар Клавы Цярэшкі. Гэта ёй гонар, а не мне.

КУЗЬМА. Усяму калгасу!

НАТАША. Дзякуй табе за такі гонар!

КУЗЬМА. Ці ж табе не хочацца, каб наш калгас на ўсю рэспубліку славуты стаў?

НАТАША. Вось таму старшынька наш так і круціцца вакол Клаўкі...

КУЗЬМА. Ды не так гэта! Старшыня кажа, калі б у нашым калгасе такіх брыгад больш было, то даўно ўжо ў мільянеры выйшлі! І чаго ты ўз'елася на Клаву? Заўтра на твой участак камбайн пераганю...

НАТАША. Не пераганіш.

КУЗЬМА. Чаму гэта?

НАТАША. А таму! Працаваць на Клаўчыным участку ты сёння не будзеш!

КУЗЬМА. А што я буду рабіць?

НАТАША. Загараць.

КУЗЬМА. Наталля! Ты што надумала?

НАТАША. Нічога страшнага. Камбайн сапсаваўся? Сапсаваўся! Можа ён сёння быць не адрамантаваны? Можа! Тэхніка!

КУЗЬМА. Ну, ведаеш... Такая тэхніка бокам можа вылезці...

НАТАША. Каму бокам, а каму і скокам...

КУЗЬМА. Дык гэта ж... злачынства!

НАТАША. Калі кахаеш, пойдзеш і на злачынства.

КУЗЬМА. Нічога сабе каханне! Наташа! І куды ж ты мяне зводзіш? Што ты ад мяне патрабуеш? Мабыць жа на такое і Дон-Кіхот не згадзіўся б...

НАТАША. А ты згодзішся!

КУЗЬМА. Наталля! Пашкадуй! Не губі маё маладое жыццё...

НАТАША (*румзае*). А ты губіш мяне—дык табе можна... Можна!? Так?

КУЗЬМА (*падумаўшы*). Эх! Альбо нябожчык, альбо палкоўнік! Усё зраблю, як ты хочаш, толькі перастань румзаць! Чуеш? Бо я таксама разрумзаюся, і будзе лямант на ўсё поле...

НАТАША (*крычыць*). Зразумей жа ты, пень яловы! Не хачу я, каб Клаўка ўзяла верх! Не хачу! Ці ж я не бачу, як яна на цябе глядзіць? Не бачу?

КУЗЬМА. А як?

НАТАША. Як кошка на сала! Вось як!

КУЗЬМА. Ну, якое на мне сала? Адны рэбры...

НАТАША. У-у! Паламаць бы табе гэтыя скабы... Так і ведай! Калі не зробіш, як я загадала,—усё! (*Выбягае*).

КУЗЬМА (*застаўся адзін, чухае патыліцу*). Ухты! Закіпела! Гэта ж трэба! Такое прыдумала... Калі, кажа, любіш, дык і жыццё сваё загубіш... Эх ты, Сільва мая сінявокая! Жыцця для цябе не шкада, а вось сумленне... Сумленне, дзяўчына, калі згубіш — нідзе больш не купіш... Таму на такую справу не пайду, хоць рэж!

Уваходзіць Клава.

КЛАВА. Ты што, хлопец, молішся?

КУЗЬМА. Ага. Надумаў у баптысты падавацца. Абяцаюць на тым свеце добрае жыццё...

КЛАВА. Ці ў цябе на гэтым кепскае? Вунь колькі вакол цябе дзяўчат...

КУЗЬМА. Дык гэта ж тое самае пекла! А на тым свеце баптысты рай абяцаюць...

(Заканчэнне на 4-й стар.).

КНІЖНЫЯ СКАРБЫ — НАРОДУ

ПЕРШЫЯ ТЫДНІ — ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

Мінула тры тыдні, як наша бібліятэка абвясціла месячнік прапаганды беларускай літаратуры. Работа, якую мы праводзім, дала станоўчыя вынікі. Пасля гутарак, літаратурных аглядаў, кніжных выставак твораў беларускіх пісьменнікаў, рэкамендацыйных спісаў, якія ёсць у бібліятэцы, на прадпрыемствах і ў інтэрнатах з'явіліся сотні новых чытачоў. Станоўчыя вынікі далі гутаркі і агляды па творах паэтаў Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Максіма Лужаніна, Аркадзя Куляшова, Алеся Зарыцкага і іншых. Пасля гэтага многія рабочыя сталі аматарамі беларускай кнігі.

Два гады назад з Вілейкі прыехала ў Мінск Надзя Стэльмах. Цяпер яна працуе на будаўніцтве інтэрната будтраста № 4 і спаборнічае за званне ўдарніка камуністычнай працы. Працуе і вучыцца на хімічным факультэце вячэрняга аддзялення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Леніна. Апроч кніг па курсу ўніверсітэта, яна многа чытае твораў беларускіх пісьменнікаў — Міхася Лынькова, Петруся Броўкі, Івана Шамякіна, Уладзіміра Карпава і інш. За апошнія дні месячніка яна зноў перачытала многія творы Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Актыўнымі чытачамі сталі яе сяброўкі па інтэрнату: Таіса Красоткіна, Галя Марункова і інш. Цікавяцца творамі беларускіх пісьменнікаў слесар завода імя Кірава Віктар Ліпніцкі, ткачыхі камвольнага камбіната Ніна Барсук і Ніна Козел, цясляр Вечаслаў Шыманскі, пенсіянер Уладзімір Аляксандравіч Богуш.

За лістапад чытачам выдадзена 490 кніг твораў беларускіх пісьменнікаў, а за два тыдні снежня — каля 900. За гэты час бібліятэка папоўнілася 300 выданнямі твораў пісьменнікаў рэспублікі.

За час месячніка праведзены масавыя мерапрыемствы ў бібліятэцы і на прадпрыемствах раёна. Гэта — літаратурны вечар, прысвечаны творчасці Міхася Лынькова, гутаркі, літаратурныя агляды, лекцыі на цагельным заводзе, камвольным камбінаце, у інтэрнаце будтраста № 4, на электрамеханічным заводзе, мясакамбінаце.

Нядаўна работнікі бібліятэкі з чытачамі арганізавалі экскурсіі ў Музей імя Якуба Коласа. З вялікай цікавасцю слухалі яны змястоўныя расказы экскурсаводаў. Многія чытачы ў гэты дзень наведалі Музей Вялікай Айчыннай вайны, Мастацкі музей, пабывалі ў тэатрах імя Янкі Купалы, оперы і балету, рускім драматычным.

У плане месячніка прадугледжана значна папоўніць кніжны фонд творамі беларускіх пісьменнікаў, арганізаваць у бібліятэцы Дзень пісьменніка з шырокай выдачай кніг. Мяркуецца адкрыць тры кіёскі па продажу кніг, падабраць 25 кнігаНош па распаўсюджванню беларускай літаратуры.

Пажадана, каб Кастрычніцкі райсавет дэпутатаў працоўных больш праяўляў увагі да нашай бібліятэкі і асігнаваў сродкі на набыццё дадатковай колькасці кніг.

Марыя ТАРАСЕНАК,
Ілья РЭЗНІК,
Ганна БАНДАРЭНКА,
Леў ФРЫД,
работнікі масавай бібліятэкі Кастрычніцкага раёна Мінска.

Сумленне загрызла

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

КЛАВА. Ты не дуры. Я ўсё бачыла! Камбайн стаіць, а ты тут з Наташай шуры-муры разводзіш. Ночы вам не хапае...

КУЗЬМА *(усміхаецца)*. Ты ж ведаеш — ночы зараз кароткія...

КЛАВА *(уздыхае)*. Каму кароткія, а каму...

КУЗЬМА. Ды кінь ты казанскай сіратой прыкідвацца!

КЛАВА. Кузьма, Кузьма...

КУЗЬМА. Ты што?

КЛАВА. Нічога. Ідзі ў кузню, не затрымлівайся... Сёння трэба скончыць.

КУЗЬМА. А гэта як атрымаецца. Здаецца, паломка сур'ёзная...

КЛАВА. Як? Ты ж казаў...

КУЗЬМА. Мала што я казаў! Я ж не механік... Ладна! Пайду...

Кузьма выходзіць. Клава глядзіць яму ўслед.

КЛАВА. Кузьма, Кузьма... Ліха ты маё горкае... І што ты ў гэтай Наташы знайшоў такое прывабнае? Ну, прыгожая яна... Дык я таксама не пачвара... І характар у мяне добры, лагодны. І разумная я. Праўда, яна таксама не дурная... Але ж такі характар! Ой, прападзеш ты, хлопчык! Не гуляў бы ты з агнём, бо рукі папячэш...

Уваходзіць старшыня калгаса Перапечка.

ПЕРАПЕЧКА. Ну і горача! Мабыць, ж у той ракеце, што вакол месяца круціцца... І што гэта робіцца ў прыродзе? *(Азірнуўся)*. Ну, глядзі ты на яе! Вось настырная дзеўка! *(З'яўляецца Наташа)*. Наталля! Пакінь мяне ў спакоі!

НАТАША. Не пакіну! Усё ёй! А чым я горшая? Чым?

ПЕРАПЕЧКА. Усе птушкі крылы маюць, ды не ўсе лётаюць!

НАТАША. А-а! Выказаўся нарэшце! Падвёў вынікі! Але не будзе па-твойму, старшынька ты мой даражэнькі! Не будзе! Маем крылы і лётаць будзем! Будзем!

ПЕРАПЕЧКА. То і добра! Перагоніш Клаву Цярэшка—усяму калгасу лепш будзе! Хутчэй Амерыку перагонім!

НАТАША. Ты мне Амерыкай зубы не загаварвай! Камбайн давай!

ПЕРАПЕЧКА. Колькі разоў табе паўтараць: сёння скончым на дзялянцы Цярэшкі, заўтра да цябе...

КЛАВА *(падыходзячы)*. Нічога мы сёння не скончым, старшыня.

ПЕРАПЕЧКА. А што такое?

КЛАВА. Камбайн сапсаваўся.

ПЕРАПЕЧКА. Што ты кажаш? Вось табе і раз. Вось табе і два...

КЛАВА. Дык я так мяркую... Адрамантуюць камбайн, і хай яго бярэ Наташа. Мы і рукамі здолеем.

ПЕРАПЕЧКА. Таварыш Цярэшка! Якое ты маеш права адмяняць мае дырэктывы? А? Бач, моду ўзяла! Яна мяркуе!

НАТАША. Якая разумніца! Камбайн сапсаваўся, дык яна яго мне! Дзякуй за такую ласку!

ПЕРАПЕЧКА. Ціха! Раскудхталіся! Зараз разбярэм, што там здарылася, і потым будзем вырашаць. Ціха, кажу! Бач ты! Моду ўзялі...

Паспешліва выходзіць, Клава садзіцца каля бочкі з вадой.

КЛАВА. Прысядзь і ты. Пагаворым.

НАТАША. Няма часу сядзець, ды і няма аб чым гаварыць нам з табою.

КЛАВА. Не, ты скажы... Чаму, як прызначылі цябе начальніцай, дык злым вокам ты ў мой бок косіш?

НАТАША. А як ты сама думаеш—чаму?

КЛАВА. Думаю, завідкі цябе бяруць.

НАТАША. А чаму ж не пазайздросціць лепшай звеннявой калгаса?

КЛАВА. А чым жа тваё звяно горшае?

НАТАША. А ты пра гэта спытай у нашага даражэнькага Перапечкі, у нашай калгаснай галавы...

КЛАВА. А навошта?

НАТАША. Адкуль жа мне ведаць, чаму ён з вашай брыгадай носіцца, як з пісанай торбай...

КЛАВА. Вось ніколі не думала, што ў цябе столькі несвядомасці...

НАТАША. Затое ты вельмі свядомая.

КЛАВА. Ну, добра. Давай разбярэмся... Памятаеш, вясной я пытала ў цябе парады. Памятаеш? Тады ты на ўсю вобласць славілася... І радыё і газеты амаль кожны дзень трубілі: знатная ільнаводка, майстар высокіх ураджаяў... Вось і прыйшла я да цябе як да майстра. Дык што ты мне тады адказала, памятаеш? Калі не—магу напомніць...

НАТАША *(крыху збянтэжана)*. Не трэба. Памяці я яшчэ не страціла. А ці ж няпраўду я тады казала? Мы з табою спаборнічаем... І якія ж могуць быць парады?

КЛАВА. Няўжо ты да гэтага часу лічыш, што зрабіла правільна?

Паўза.

НАТАША. Чаго ты да мяне прычапілася?! Чаго?

КЛАВА. Ты не гарачыся... Ты лепш спакойна адкажы.

НАТАША. Адкажу! Слухай! Калі хочаш ведаць, ніякіх парад мне не шкада... А вось як пабачыла я, якімі вачыма ты на майго Кузьму глядзіш, дык сказала сама сабе: ніякіх парад! Нічым дзяліцца не жадаю: ні вопытам, ні Кузьмою.

КЛАВА *(усміхаецца)*. Смешная ты... Ну, твой вопыт—пры табе. А Кузьма—не твая ўласнасць...

НАТАША. Мая!

КЛАВА. Супакойся... Калі ён цябе кахае, дык каму ён патрэбен?

НАТАША. Ведаю я цябе! Вось па ільну мяне перагнала, хочаш і Кузьму...

КЛАВА. Эх, Наталля, Наталля...

НАТАША. Дзевятнаццаць год Наталля!

Уваходзіць заклапочаны Перапечка.

ПЕРАПЕЧКА. Ай-ай-ай! Ну і навала! Адным словам: тыц-мыц — няма чаго казаць... Што ж, дзяўчаткі, давядзецца рукамі лянок выбіраць... Падвёў нас Кузьма...

НАТАША. Старшыня! Кузьму не чапай!

ПЕРАПЕЧКА. Вось-вось... У нашых месцах ёсць такая прымаўка... Я за свайго Кузьму і дзесяць вазьму, а ты сваю Капярынку вазі па рынку... Кузьму твайго я не чапаю. Гэты камбайн вялікае жыццё пражыў, пакуль да нас у калгас трапіў... То Кузьму і вінаваціць грэх...

НАТАША. Вінаваць не вінаваць, а камбайн стаіць!

ПЕРАПЕЧКА. Таму мы зробім так... Тваё звяно, Наталля, пасля абеду пойдзе на дзялянку Клавы...

НАТАША. А чаго я там не бачыла?

ПЕРАПЕЧКА. Сёння дапаможаш Клаве, а заўтра...

НАТАША *(ніза пакланілася)*. Вялікае дзякуй табе, наш старшынька, вельмі разумная калгасная галава. Толькі і тут *(пастукала пальцам сябе па галаве)* не качан капусты. І таму — не бываць гэтаму!

ПЕРАПЕЧКА. Наталля! Кінь блазнаваць!

КЛАВА. Паслухайце, старшыня... Не трэба мне яе дапамога. Як-небудзь і без яе справімся.

ПЕРАПЕЧКА. Клаўдзя! Не лезь у мае распараджэнні! Бач, моду ўзялі! Ой, дзеўкі, вазьмуся я за вас!

КЛАВА. Вы паслухайце! Зробім лепш так. Сёння пасля абеду маё звяно пойдзе на дзялянку да яе. Да вечара сумесна мы дабярэм увесь іхні лён, а заўтра возьмемся за мой участак. Якая тут розніца? Усё ж калгаснае...

ПЕРАПЕЧКА. Разумніца ты мая! Згодзен, згодзен! Разумныя парады прыемна слухаць. Дык дзейнічай, Клаўдзя! А я да суседзяў злётаю, мо ў іх знойдзецца гэтая праклятая шасцяронка... *(выходзіць)*.

Паўза.

НАТАША. Ты... гэта сур'ёзна?

КЛАВА. Ты ж ведаеш... Я не вельмі здатная да жартаў... Таму, мо, і хлопцы мяне абыходзяць.

НАТАША. Дык што ж гэта ты такое задумала?

КЛАВА. А тое і задумала. *(Чуецца дзявочая песня. Яна набліжаецца)*. Вунь і дзяўчаты мае з рэчкі ідуць... Зіна, Мар'я! Клічце сюды ўсіх! *(Чуваць голас за сцэнай:* «Яшчэ ў рэчцы сядзяць!»)

НАТАША *(задуменна)*. Нешта не разумею я цябе, Клаўка...

КЛАВА. Ты спачатку сама сябе зразумей...

Уваходзяць Зіна і Мар'я.

ЗІНА. Начальніца! Гэта праўда пра камбайн?

КЛАВА. Праўда.

ЗІНА. Вось гэты Кузьма! *(Ускінула раптам рукі ды пайшла кругам, нібы тая пава)*.

Ой, сцяжынка ў полі ўецца,
Абапал яе ільны.
Усё звяно з Кузьмы смяецца.
А яму дык хоць бы...

МАР'Я. Хны!

ЗІНА *(пяе)*. А яму дык хоць бы хны!

КЛАВА. Ой, глядзіце, за Кузьму Наташа вам вочы павыдзірае...

ЗІНА. А ці ж няпраўда?

МАР'Я. Гэта ж праз яго давядзецца нам папацець...

НАТАША *(да Клавы)*. Усё ж незразумелая ты для мяне...

КЛАВА. Паразумнееш сама, і мяне зразумееш...

НАТАША. Не веру я табе, што на маёй дзялянцы будзеш ты працаваць, як на сваёй...

КЛАВА. Ці ж сумленне дазволіць мне інакш?

МАР'Я. А навошта яна павінна рабіць на тваёй дзялянцы?

ЗІНА. У нас жа свая ёсць!

КЛАВА. Дзяўчаткі... Я вам яшчэ не сказала... Пасля абеду мы будзем працаваць на яе дзялянцы... Старшыня так вырашыў.

МАР'Я. Старшыня? Не мог ён да гэтага дадумацца!

ЗІНА. Гэта ты сама! Ведаем мы цябе!

КЛАВА. Дзяўчаткі... Зразумейце... Не адно наша звяно трэба цягнуць у перадавыя... Трэба, каб усе... Каб увесь калгас...

ЗІНА. Гэта мы разумеем! Не маленькія. Але вельмі прыемна быць наперадзе! Ой, дзяўчаткі! Люблю я гонар і павагу! Мяне хлебам не кармі, толькі пакрасавацца на партрэце ў газеце! *(Смяецца)*. Памятаеце, калі партрэты нашы надрукавалі ў райгазеце... Дык я сама сябе не пазнала. Каб не подпіс... *(Смяецца)*.

КЛАВА *(глядзіць на ручны гадзіннік)*. Дзяўчаткі! Канец перакуру! Пойдзем! Мар'я, кліч усіх... *(Зіна і Мар'я выходзяць)*. Пойдзем, Наташа. Кінь хмурыць свае прыгожыя вочкі...

НАТАША. Каб ты ведала, што нарабіла...

КЛАВА. А што?

НАТАША. Усю душу маю перавярнула... Ты ідзі, ідзі... Я зараз. Мае дзяўчаты ўсе на месцы... А я зараз... Пакінь мяне. *(Клава выходзіць. Наташа абхапіла галаву рукамі)*. Ой, дзяўчаткі вы мае мілыя! Што ж гэта я, дурніца, нарабіла! Вось кашу заварыла! Як толькі расхлябаю... Мамачка мая родненькая! *(Пачынае сама сябе біць па твары)*. Вось табе! Вось табе, вось табе... Каб не зайздросціла! Каб не спакушала добрых людзей на махлярствы...

Уваходзіць Кузьма. Глядзіць на Наташу, ухмыляецца.

КУЗЬМА. Мо, дапамагчы?

НАТАША. Ой! А-а... Гэта ты, галубок... З'явіўся! Ты чаму мяне не ўтрымаў? Які ты мужчына, калі дзявочаму капрызу паддаўся?!

КУЗЬМА. Ты глядзі на яе! Сем пятніц на тыдні!

НАТАША. Як табе не сорамна згаджацца на такое? Сумленне ў цябе няма! Зараз жа гані камбайн! Чуеш?

КУЗЬМА. Чую. Толькі камбайн слухаць мяне не хоча.

НАТАША. Як гэта не хоча?

КУЗЬМА. Вельмі проста.

НАТАША. Тады... Тады забудзь нават маё імя!

КУЗЬМА. А-а-а... Сумленне загрызла!

НАТАША. Загрызла! Бо ёсць яно ў мяне...

КУЗЬМА. А ў мяне, выходзіць, няма?

НАТАША *(раптам кінулася да яго, абняла)*. Любы мой! Я цяпер веру, веру, што кахаеш! І нічога не трэба даказваць... Прабач мне... Гэта ж я пажартавала! І ты ўсур'ёз. Ух ты, мой дон-кіхоцік! Слухай! Цяпер выканай мой новы загад: зараз жа пусці камбайн! Чуеш?

КУЗЬМА. Чую, але камбайн пусціць не магу.

НАТАША. Я ж табе кажу: веру, што любіш, веру!

КУЗЬМА. Усё роўна не магу. Камбайн сапраўды сапсаваўся. Мо, толькі заўтра адрамантуюць...

НАТАША. Не маніш? Гэта праўда? Ох, проста гара з плеч...

КУЗЬМА. Відаць, сурочыла ты камбайн. Вока ў цябе нядобрае...

НАТАША. Што ты! Вока ў мяне добрае! Гэта сэрца ў мяне вельмі гарачае. Клава мяне сёння добра падкалупнула... Павучыла дурніцу... І ведаеш, Кузьма, што я вырашыла... Выйду за цябе замуж! Хопіць! З табою каля боку мне спакайней будзе. Заўтра ж едзем у сельсавет!

КУЗЬМА. Страшная ты жанчына!

НАТАША. Гэта я страшная? Для цябе?

КУЗЬМА. Ага! Гэта ж ледзьве не прымусіла мяне пайсці на злачынства, а цяпер ты куды мяне цягнеш? Куды?

НАТАША *(разгубілася)*. Да сябе цягну... А што?

КУЗЬМА. Нічога! Адкуль мне ведаць, што гэта не чарговы твае капрыз? А?

НАТАША. Куза... Ну што ты...

КУЗЬМА. Дакажы!

НАТАША. А як?

КУЗЬМА. Цалуй!

НАТАША. Я? Цябе? Першай?

КУЗЬМА. Ты! Мяне! Першай!

НАТАША *(уздыхае)*. Дэспат! *(Цалуе)*. Варвар! *(Цалуе)*. Чые маё сэрца, загубіш ты маё маладое жыццё...

КУЗЬМА *(смяецца, моцна абдымае Наташу, цалуе)*. І загублю!

НАТАША. Я табе загублю! Бач ты яго! Ні пікні! Я табе...

КУЗЬМА. Ну вось... Тыгра ты, а не жанчына. Загрызеш мяне.

НАТАША. І загрызу, калі не будзеш слухацца і шанаваць!

ГОЛАС КЛАВЫ: «Наташа! Хадзем!»

НАТАША. Іду, іду!

КЛАВА *(выходзіць)*. А камбайнёр тут... Вось-вось, у самы раз... Камбайн стаіць, а ён...

КУЗЬМА. А я жанюся! І не турбуйся, звенявая! Усё будзе як мае быць! Сілы ў мяне зараз удвая прыбавілася. Ух ты, Сільва мая сінявокая! Зажывём мы з табою! *(Выбягае)*.

НАТАША *(усміхаецца)*. Бачыла псіха?

КЛАВА *(уздыхае)*. Гэта ён ад шчасця ачмурэў... Шчаслівая ты, Наталля!

ЗАСЛОНА.

СВОЕАСАБЛІВАСЦЬ ЖАНРА

Трэцяя праграма Мінскага цырка прыцягвае гледача не столькі тым, што выконваецца на манежы, колькі стылем, манерай выканання. У гэтай праграме мы бачым сабачак, коней, вярблюдаў, мядзведзяў, ёсць і апаратура з электраматорамі, якая круціцца пад купалам. Але галоўнае тут — чалавек-выканаўца.

Захопленыя віртуознай тэхнікай заслужанага артыста РСФСР Мікалая Альховікава, гледачы перш за ўсё ўспрыймаюць яго прывабны чалавечы вобраз. У простым сціплым касцюме, з ветлівай і нейкай вабячай усмешкай ён пачынае жанглераваць, таксама проста і сціпла, як сярод сяброў. Альховікаў іграе рознымі рэчамі лёгка і свабодна. На кані, які імчыцца па кругу, ён адчувае сябе, як на зямлі. Углядзіцеся ў яго фігуру, у твар: на іх не відаць ніякага напружання, а толькі вялікая радасць чалавека, якому ўсё лёгка, які як бы запрашае і гледача: «Ты гэта таксама можаш рабіць». Але трукі, якія выконваюцца з такой прастатой і натуральнасцю, зрабіць не так ужо і проста.

Але вось манеж займаюць чатыры вярблюды з абвіслымі мяшкамі. У павольным рытме, як і належыць гэтым ціхаходам, рухаюцца яны па кругу. Сумна праходзіць выступленне шматлікага калектыву акрабатаў на вярблюдах Кадыр-Гулям пад кіраўніцтвам Янушэўскага. Шэрыя гмахі засланяюць людзей. Таму і сумны нумар. Думаецца, што тыя ж акрабаты без вярблюдаў здолелі б стварыць больш яркі нумар, бо ў складзе гэтай трупы ёсць здольныя выканаўцы.

Было б няправільна думаць, што жывёлы перашкаджаюць артыстам. Гэта адбываецца толькі ў тых выпадках, калі дорагакаштуючая экзотыка вылучаецца рэжысурай на першы план, засланяючы чалавека.

У сэнсе ўмення знайсці свой непаўторны вобраз на манежы характэрна выступленне італьянскага артыста — дрэсіроўшчыка мядзведзяў Луіджы Безано. У Луіджы і Мікалая Альховікава ёсць агульнае: абаяльнасць, прастата і сціпласць. Безано праз увесь час прадстаўлення маўчыць, але нам здаецца, што мы чуем яго голас, такая выразная міміка артыста. Прычым, у гэтай мімічнай размове адчуваецца вялікая стрыманасць. Са сваімі сімпатычнымі мішкамі ён абыходзіцца па-сяброўску проста. Нічога няма наўмыснага ў яго мізансцэнах (няхай прабачаць нам перанясенне гэтага тэатральнага тэрміна на манеж), усё вельмі звычайна. Безано выконвае з мядзведзем разнастайныя акрабатычныя практыкаванні: перавароты, стойкі. Вось мядзведзь робіць стойку на пярэдніх лапах... на галаве ў Луіджы. Артыст без бачнага напружання, з добрай і крыху іранічнай усмешкай вытрымлівае на сабе мядзведжую тушу. І нарэшце ўсеагульнае захапленне выклікае мядзведзь, які едзе на веласіпедзе, а затым і на матацыкле.

У параўнанні з прыведзенымі нумарамі слабое ўражанне робяць дрэсіраваныя сабачкі Быстровай.

На кані выступала гратэск-наезніца і сальтамартыстка Валянціна Леры. Яна нядрэнна выканала некалькі сальтамартале і танец на спіне каня. У яе грацыёзная і выразная творчая манера. На жаль, танец перад пачаткам нумару арганічна з ім не зліваецца. Выступленне Леры глядзелася б лепш, калі б артыстка праводзіла яго ў больш хуткім тэмпе.

Танец — арганічная аснова нумару жанглёраў — іспанскіх артыстаў Элеаноры і Энрыка Дэльбоске. Іх выступленне вылучаецца добрым густам і прадуманасцю кожнага руху.

Акрабаты-вальтыжоры Дзеравянка прадэманстравалі рад цікавых, хоць і традыцыйных трукаў. Якасць іх выступлення крыху траціць ад прыкметнай нервознасці артыстаў. Нядрэнна працуе ў гэтай групе маленькі хлопчык. Усё ідзе добра, пакуль маленькі артыст выконвае лёгка трукі. Але вось бацька спрабуе вывесці яго ў стойку на адной руцэ. Спроба паўтараецца тры або чатыры разы, але няўдала. Слабым дзіцячым рукам гэтая нагрузка аказваецца не пад сілу.

Цікавыя выступленні на турніках артыстаў Зіміных і паветраных гімнастаў Зементавых. Іх кампазіцыі добра прадуманы, дакладна і сіметрычна пабудаваны.

Клаунада прадстаўлена здольнымі артыстамі Крэйнам і Успенскім. Але іх рэпертуар на гэты раз быў не з лепшых і абмежаваўся тым, што на манежы клоуны з дапамогай Эдуарда Серады расціскалі паветраныя шарыкі і прачыталі некалькі смешных вершаў.

Аднак Эдуард Серада ў трэцяй праграме знайшоў новыя смешныя рэпрызы, стаў больш сціплым і простым. З ім на дыване працуе Федзя Лібень. Прыемны той факт, што артыст няўхільна стварае новы вобраз дывановага клоуна. Рад майстроў, такіх, як Карандаш, Алег Папоў, ужо стварылі такія вобразы. Серада яшчэ не можа пахваліцца сваім рэпертуарам, але ён на правільным шляху. Адмаўленне ад традыцыйнай клоунскай маскі набліжае артыста да публікі. Серада стварае вобраз вясёлага, жыццярадаснага сучасніка, крыху няўдачніка, але які ніколі не сумуе, пераадольвае няўдачы.

У сэнсе арганізацыі праграмы ў адзінае цэлае немалую ролю адыгрывае рэжысёр. Ён закліканы дапамагчы стварэнню цікавага і захапляючага відовішча. Заслужаны артыст БССР В. Пацехін, — вопытны тэатральны рэжысёр, прынёс сваё веданне законаў тэатра ў цырк. Вельмі цяжка, вядома, рэжысёру працаваць над афармленнем ужо гатовых нумароў гастралёраў. Але звесці праграму ў адзінае цэлае, накіраваць дывановага клоуна рэжысёр можа. В. Пацехін удала паставіў пралог і фінал прадстаўлення. Нядрэнна падабраны і парадак асобных выступленняў.

...На манежы балерына—заслужаная артыстка РСФСР Лагачова. Жыццярадасная, тэмпераментная, яна вітае публіку. І вось музыка, знаёмая класічная музыка гучыць пад купалам цырка. Лагачова танцуе. Складаныя «па» зліваюцца ў прыгожы і эмацыянальны паветраны танец. Павольныя і плаўныя рытмы змяняюцца тэмпераментнай мазуркай... І не адчуваецца ні стомленасці, ні найменшага напружання. Мы забываем аб тым, што дзяўчына танцуе ў цырку, а пад нагамі ў яе тонкі дрот. Такая сіла мастацтва, сапраўднага сталага майстэрства!

Ф. ВЫСОЦКІ.

На здымках: 1. Танцы на дроце выконвае артыстка Н. Лагачова.

2. Артыст Л. Безано са сваімі выхаванцамі.

МУЗЕЙ СЛАВЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 15 год. У цяжкія дні вайны, у 1943 г., наладжваліся выстаўкі «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца» ў памяшканні Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Гэта і былі першыя крокі да стварэння музея.

7 лістапада 1944 г. у вызваленым Мінску адкрылася першая выстаўка «Узбраенне беларускіх партызан». Гэты дзень стаў датай заснавання музея.

За 15 год у музеі пабывала больш 1 300 000 наведвальнікаў. Сярод іх — людзі розных узростаў і прафесій, нацыянальнасцей і краін. Яны высока ацэньваюць работу музея.

«Я ў захапленні гістарычнымі перамогамі беларускага народа, — піша армянскі паэт Геворк Эмін. — У гэтым музеі з вялікім майстэрствам паказаны гераізм братняга беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, веліч і прыгажосць народнай душы, стойкасць яго духу. Мяне вельмі радуе, што супрацоўнікі музея выдатна расказваюць пра ваенную дружбу братніх народаў Савецкага Саюза. Няхай жыве цудоўны працавіты беларускі народ, яго гераічныя сыны і дочкі, таленавітыя будаўнікі культуры, народнай гаспадаркі і ўсіх галін дзейнасці чалавека».

Частымі гасцямі музея сталі дэлегацыі і турысты зарубежных сацыялістычных і буржуазных краін. Толькі за апошнія тры гады музей наведалі дэлегацыі 62 краін свету.

«Вельмі памятнае для мяне наведанне музея Айчыннай вайны. Тут многа экспанатаў, якія расказваюць пра гераічную гісторыю Беларусі, — піша грэчаскі паэт Алексіс Парніс. — Як стары партызан з Грэцыі, я запомню і многіх таварышаў па зброі, беларускіх партызан, якія змагаліся ў антыфашысцкай вайне 1941—1945 гадоў.

Памяць аб іх назаўсёды захаваецца ў сэрцах усіх народаў».

Музей сабраў каля 195 000 экспанатаў. Ён стаў самым буйным у краіне сховішчам свяшчэнных рэліквій перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Сярод экспанатаў мноства ўнікальных рэчаў, каштоўных гістарычных дакументаў. Асабліва вялікі фонд матэрыялаў аб партызанскім руху на Беларусі. Музей мае багацейшы негатыўны фонд, які перавышае 16 000 надзвычай каштоўных негатываў. У выяўленні і збіранні рэліквій перыяду Кастрычніка, грамадзянскай вайны і асабліва Вялікай Айчыннай вайны значную дапамогу аказвае актыў музея — больш тысячы чалавек — ветэранаў Кастрычніка і грамадзянскай вайны, франтавікоў і партызан Вялікай Айчыннай вайны, партыйных работнікаў, рабочых і калгаснікаў, навучэнцаў.

Сваімі багатымі калекцыямі музей дзеліцца з многімі музеямі братніх рэспублік краіны. Ім перададзена каля 115 000 розных экспанатаў.

Цяпер у фондах музея — больш 80 000 экспанатаў. Паказваецца ж не больш 4,5 тысячы. Музей мае вялікія магчымасці надалей пашыраць сваю экспазіцыю.

Калектыў навуковых супрацоўнікаў у меру сваіх сіл і магчымасцей вывучае асобныя тэмы і праблемы гісторыі партызанскага руху; выдадзены манаграфіі пра Гастэлу і Заслонава і тры вялікія альбомы. У друку — вялікая праца пра помнікі і памятныя мясціны Беларусі. Зборнік успамінаў былых партызан Вялікай Айчыннай вайны падрыхтаваны сумесна з Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР. «Даведнік па залах музея» неўзабаве павінен выйсці ў свет. У 1960 г. будуць выдадзены тры зборнікі кароткіх біяграфій Герояў Савецкага Саюза — ураджэнцаў Беларусі, якія вызначыліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, сыноў братніх народаў, якія вызначыліся пры вызваленні нашай рэспублікі ад ворага, і Герояў Савецкага Саюза — беларускіх партызан. Падрыхтаваны і іншыя важныя работы, якія будуць выдадзены ў выглядзе брашур. Супрацоўнік музея тав. Лавецкі працуе над тэмай «Узаемадзеянне партызан Беларусі з партызанамі братніх рэспублік». Збіраюцца матэрыялы для другога зборніка ўспамінаў былых партызан.

Музей не абмяжоўваецца абслугоўваннем экскурсантаў. У яго залах сістэматычна праводзяцца сустрэчы знатных людзей рэспублікі — ветэранаў Кастрычніка і грамадзянскай вайны, Герояў Савецкага Саюза — франтавікоў і партызан, Герояў Сацыялістычнай Працы, перадавікоў вытворчасці з наведвальнікамі музея.

Адной з форм распаўсюджвання ведаў музей абраў тэматычныя перасоўныя выстаўкі. За 15 год арганізавана 49 такіх выставак, якія агледзела больш 3 000 000 чалавек. Дзве выстаўкі і цяпер экспануюцца на будаўніцтве Полацкага нафтаперапрацоўчага завода і Старобінскага калійнага камбіната.

Супрацоўнікі музея актыўна ўдзельнічаюць у лекцыйнай прапагандзе. За 15 год імі прачытана больш 3 000 лекцый на прадпрыемствах і на вёсцы. Яны арганізоўваюць і праводзяць экскурсіі працоўных па гісторыка-рэвалюцыйных месцах у горадзе і па месцах баёў Савецкай Арміі і партызан. Такіх экскурсій наладжана за апошнія 10 год больш 800. Выяўляюцца памятныя мясціны перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Музеі партызанскай славы створаны ў Бягомлі і Чэрвені, вядзецца падрыхтоўчая работа да адкрыцця такіх музеяў у Клічаве і Валожыне.

У 1960 г. будуць узведзены будынкі і адкрыты філіялы музеяў у былых лагерах смерці і месцах масавага вынішчэння савецкіх грамадзян і ваеннапалонных — у Малым Трасцянцы, Масюкоўшчыне і Уруччы і створаны музеі-запаведнікі ў вёсцы Калодзіна і на востраве Зыслаў — на месцах былых партызанскіх стаянак.

У экспазіцыях музея значнае месца адводзіцца і працоўным подзвігам беларускага народа ў мірныя дні.

С. ШЧУЦКІ,
дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



Вялікім поспехам на Міжнароднай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Дэлі карыстаецца павільён Савецкага Саюза. Толькі за першыя дні работы павільёна ў ім пабывала звыш 100 тысяч наведвальнікаў.

На здымку: агульны выгляд савецкага павільёна.

Фота П. Крачнёва. (ТАСС).

Галоўны рэдактар Янка ШАРАХОЎСКІ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, адказнага сакратара і аддзела літаратуры—3-25-25, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-21-53, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

Друкарня імя Сталіна

АТ 02598